№ 9(39)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, 16-30 верасьня 2001 г.

**НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ „ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА” ПАД АКУПАЦЫЯЙ**



*Менск. Напад „людзей у цывільным” (гэбістаў) на чалавека. (18 траўня 2001 г., праспэкт Ф. Скарыны)*

## ПРА НЕПРЫЗНАНЬНЕ ВЫНІКАЎ ВЫБАРЧАГА ФАРСУ І НЕЛЕГІТЫМНАГА РЭЖЫМУ ЛУКАШЭНКІ

*(Зварот)*

Значная большасьць беларускага грамадзтва і ўвесь цывілізаваны сьвет мелі надзею, што прэзыдэнцкія выбары 2001 году ў Беларусі стануцца дэмакратычнай формай свабоднага волевыяўленьня беларускіх выбаршчыкаў і прывядуць да кардынальных пазытыўных зьменаў ў палітычным становішчы нашай краіны. Трэба прызнаць, што гэта былі ілюзорныя спадзяваньні. Ва ўмовах дыктатарскага рэжыму, які абапіраецца на расейскія імпэрскія колы і структуры расейскага КГБ-ФСБ, правядзеньне дэмакратычных выбараў немагчымае. Практыка паказала, што заклікі міжнароднай грамадзкасьці да Лукашэнкі „зьмякчыць” свой курс і дэмакратызавацца не былі ўспрынятыя. Рэжым дзейнічаў нахабна і агрэсіўна ў адносінах як да беларускіх грамадзянаў, так і міжнародных назіральнікаў, дыпляматаў і г.д. Рэжым адчуваў магутную падтрымку свайго гаспадара — „расейскай імпэрыі”. Толькі расейскія палітыкі і прэзыдэнт Пуцін выказалі безумоўную падтрымку палітыцы Лукашэнкі і поўнае прызнаньне вынікаў выбарчага фарсу (нават яшчэ да афіцыйнага абвяшчэньня вынікаў галасаваньня).

Зразумелая прычына такіх паводзінаў на фоне аднадушнага непрызнаньня рэжыму Лукашэнкі ўсёй дэмакратычнай міжнароднай супольнасьцю. Лукашэнка і ягонае атачэньне здаюць нашую краіну ў склад расейскай імпэрыі, здраджваюць нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Усіх уразілі маштабы фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня. Лукашэнка прыпісаў сабе да 40% галасоў і выйшаў на лічбы, якія далёка не адпавядаюць узроўню рэальнай падтрымкі яго ў грамадзтве. Назіраньні і апытаньні, праведзеныя назіральнікамі, сьведчаць аб сістэматычных, пастаўленых на канвэер фальсіфікацыях, якія рыхтаваліся і зьдзяйсьняліся дзяржаўнымі структурамі, выбарчымі камісіямі ўсіх узроўняў, падпарадкаванымі рэжыму сродкамі масавай інфармацыі. Перад усім сьветам было зьдзейсьненае групавое, бяспрыкладнае па маштабах крымінальнае злачынства. ***Паводле беларускіх законаў (калі б яны выконваліся ў нашай краіне) вынікі выбарчага фарсу павінны быць непрызнаныя, а злачынцы павінны пайсьці пад суд.***

Усе этапы выбарчай кампаніі прайшлі ў атмасфэры страху,

запалохваньня і рэпрэсіяў. Рэжым парушыў усе нормы дзейнага заканадаўства і міжнародныя дэмакратычныя нормы. У Цэнтральную і мясцовыя выбарчыя камісіі не былі дапушчаныя прадстаўнікі палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, якія апаніруюць рэжыму. На зборшчыкаў подпісаў за альтэрнатыўных прэтэндэнтаў у кандыдаты нападалі і арыштоўвалі па загаду ўладаў. Дяржаўныя сродкі масавай інфармацыі працавалі на прапаганду адной асобы — Лукашэнкі. Рэдакцыі і выдавецтвы незалежнай прэсы апынуліся пад паліцэйскімі рэпрэсіямі. Супраць апанэнтаў рэжыму ўжываліся мэтады шальмаваньня і хлусьлівага паклёпніцтва. На акцыю фальсіфікацыі ў падтрымку Лукашэнкі была мабілізаваная ўся сістэма ўлады: міліцыя і пракуратура, спэцслужбы, намэнклятура выканаўчых структураў, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстановаў. Яны выкарыстоўвалі пагрозы ў адрас сваіх падначаленых і мэтады эканамічнага ўціску. З 4-га верасьня, калі пачалося так званае „датэрміновае галасаваньне”, парушэньне рэжымам заканадаўства набыло асаблівы размах.Гэта было сапраўднае прымусовае галасаваньне. Людзей саджалі ў службовыя аўтобусы і ў працоўны час завозілі на выбарчыя ўчасткі, каб забясьпечыць высокі працэнт папярэдняга галасаваньня. І забясьпечылі ў розных рэгіёнах лічбу папярэдняга галасаваньня на ўзроўні да 60% ад агульнай колькасьці выбаршчыкаў. Гэтыя фантастычныя лічбы сьведчаць аб гвалце над электаратам і прафанацыі ідэі дэмакратычных выбараў.

Асноўны ўдар рэпрэсіўнай машыны рэжым сьціраваў супраць актывістаў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Сяброў



***Так званае „папярэдняе галасаваньне”. „Выязную” скрыню прывезьлі на вёску да дзедкі з бабкай.***

нашай Партыі арыштоўвалі, зьбівалі, падвяргалі судоваму пасьледу міліцыя і спэцслужбы. Такія мэтады ўжываліся па ўсёй краіне.

9 верасьня, у асноўны дзень галасаваньня, назіральнікі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі выявілі, што дзейнасьцю выбарчых камісіяў усіх узроўняў рэальна кіравалі прадстаўнікі выканаўчай улады. Па ўсёй краіне актыўна галасавалі неграмадзяне Беларусі (грамадзяне Расеі), незаконна ўнесеныя ў сьпісы. У сьпісы для галасаваньня былі ўключаныя непаўнагадовыя і памерлыя. Камісіі дазвалялі галасаваць людзям, уносячы іх у дадатковыя сьпісы і не патрабуючы ад іх дакумантаў. Раённыя выбарчыя камісіі знаходзіліся ў будынках раённых дзяржаўных адміністрацыяў і пад кантролем гэтай адміністрацыі. Па многіх выбарчых участках назіральнікам было адмоўлена ў акрэдытацыі альбо іх выдалялі з дапамогай міліцыі з участкаў, калі яны пачыналі сваю працу.

Асноўныя фальсіфікацыі рабіліся пры падліку галасоў пры датэрміновым і асноўным галасаваньні. Міліцыя ўмешвалася і дапамагала аддаляць назіральнікаў ад месцаў падліку бюлетэняў. Назіральнікі маглі бачыць толькі плечы членаў камісіі на адлегласьці 6-10 мэтраў. Аднак, у некаторых выпадках, назіральнікі ўсё-такі здолелі ўбачыць, што складзеныя ў стосы падлічаныя бюлетэні не адпавядаюць афіцыйнай статыстыцы аб „сакрушальнай перамозе Лукашэнкі”.

Назіральнікі ад *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* афармілі сотні актаў і пратаколаў па фактах падобных парушэньняў. Гэтыя матэр’ялы перададзеныя ў міжнародныя арганізацыі.

А. Лукашэнка ня ёсьць выбраным прэзыдэнтам, ня ёсьць легітымным кіраўніком выканаўчай улады.

***Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ не прызнаюць выбары 9-га верасьня за дэмакратычныя і справядлівыя. Мы зьвяртаемся да ўсіх урадаў і парляманатаў краінаў АБСЭ, якія мелі сваіх назіральнікаў і прадстаўнікоў у Беларусі, з заклікам не пырзнаваць гэтыя выбары за сапраўдныя, не прызнаваць легальнасьць існуючай улады ў Беларусі.***

***Мы заяўляем пра неабходнасьць адмены сфальшаваных вынікаў выбараў 9-га верасьня і дамагаемся правядзеньня новых выбараў прэзыдэнта на Беларусі пад кантролем і пратэктаратам міжналодных арганізацыяў.***

Мы заклікаем беларусаў стаць на абарону нашай незалежнасьці, мовы, уласнасьці.

Беларусь мусіць быць дзяржавай права на дэмакратычнай аснове, краінай, дзе шануецца беларускі дзяржаўны суверэнітэт, закон, культура і правы асобы. Беларусь, якая выступае супраць дыктатуры, стаіць за справядлівасьць і цывілізаванае супрацоўніцтва з усім дэмакратычным сьветам.

***Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***
*22 верасьня 2001 г.*

# КРЫМІНАЛЬНЫЯ ВЫБАРЫ

Такога падзікунства на выбарах у Беларусі яшчэ не было, здаецца, ніколі. Лекцыя для ўсёй нашай гісторыі, што такое „уласьць”. Чэрнь і дрэнь выпаўзла на паверхню жыцьця. Якія законы, якая мараль...

Спадар ***Васіль Васільчанка*** быў незалежным грамадзкім назіральнікам за галасаваньнем на выбарах у Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласьці. Ён заўважыў парушэньні і хацеў іх зафіксаваць, зьвярнуў увагу на гэта ўчастковай камісіі. Узьнікла спрэчка. Кіраўнік Клімавіцкай раённай вертыкалі **Уладзімер Канавалаў** (старшыня райвыканкама, які па закону не павінен прысутнічаць у выбарчай камісіі) накінуўся на спадара *Васільчанку* з кулакамі і з нагамі і ў прысутнасьці шматлікіх сьведкаў так зьбіў назіральніка, што прабіў вуха (лопнула перапонка) і пашкодзіў яму іншыя часткі цела.

Па загаду начальніка *Васільчанку* забрала міліцыя, адвезьлі ў пастарунак і ўкінулі ў камэру з крымінальнікамі. У цэлі плошчай 5м$^2$ сядзела шэсьць чалавек. Спалі па чарзе. Было вельмі холадна. Усе крымінальнікі курылі. У спадара *Валільчанкі* пачало гніць вуха, неверагодны боль, абвастрыліся ўсе яго захворваньні. Але яго ня выпускалі. Потым, калі чалавек пачаў крычаць ад болю, міліцыя, пабаяўшыся адказнасьці, яго выпусьціла.

Ва ўсіх медычных установах Клімавічаў і ў міліцыі (па званку начальства) яму адмовілі ў правядзеньні мэдычнай экспэртызы і зафіксаваньні пабояў. Тады спадар *Васільчанка* трапіў у Магілёўскі шпіталь, дзе яму зафіксавалі пашкоджаньні цела і пабоі. Але калі ён зноў зьявіўся ў Клімавічах, то кіраўнік раённай улады падабраў „сьведкаў”, якія сказалі, што *сп. Васільчанка* лаяўся і чапляўся на вуліцы да прахожых.

Актывіста незалежнага назіраньня пацягнулі ў суд, дзе прысудзілі яму 10 сутак арышту. На судзе спадару Васільчанку стала зусім дрэнна, і яго з дыягназам „гіпертанічны крыз” адвезьлі ў шпіталь.

* * *

Перад выбарамі пасадзілі пад арышт на 15 сутак Бялыніцкага (Магілёўская вобласьць) раённага каардынатара незалежнага назіраньня *спадара* ***Алега Мяцеліцу***. Яго абвінавацілі ў правядзеньні „несанкцыянаванага мітынгу” за тое, што ў ягонай кватэры адбывалася нарада назіральнікаў за выбарамі, дзейнасьць якіх каардынуе *спадар*

*Мяцеліца.* Міліцыя ўламалася ў кватэру спадара Мяцеліцы і аб’явіла ягоных гасьцей „мітынгам”. (Тут зазначым, што гэта ня проста самадурнае бясправўе, а менавіта бясправўе акупацыйнае. Людзей не трактуюць як праўных грамадзянаў краіны, у якой ёсьць агульныя для ўсіх законы.)

На дзясяты дзень знаходжаньня спадара А. Мяцеліцы ў арыштанцкай камэры міліцыя правяла ў ягонай кватэры і гаражы вобыск. Знайшлі перадвыбарчыя лістоўкі і налепкі супраць Лукашэнкі. Тут жа завялі на спадара А. Мяцеліцу крымінальную справу за абразу гонару і годнасьці Лукашэнкі.

Небясьпечна цяпер беларусам на Беларусі.

***А. МІКША***

# „ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ — ПАДРОБКА”

*Прадстаўнік ЗША ў АБСЭ* ***Джозэф Прэсал*** *даў ацэнку выбарам Прэзыдэнта ў Беларусі. Вось яго выказваньні:*

“Паводле нашага меркаваньня, апошнія выбары ў Беларусі — падробка. Пацьверджаньнем гэтаму — заява нашага Прэзыдэнта і некаторых іншых амэрыканскіх палітыкаў.

Я думаю, што мы больш рашуча асуджаем несправядлівасьць беларускіх выбараў, чым некаторыя краіны Заходняй Эўропы.

Найбольш нас засмучае нават ня тое, што выбары былі несвабодныя і несправядлівыя, хаця гэта таксама вельмі кепска. Нас засмучае тое, што з 1996 года Беларусь зусім ня зрушылася ў кірунку выбарчых стандартаў цывілізаванага сьвету. Беларусь, хутчэй, зрабіла крок у адваротным кірунку, Беларусь ізалявала сябе амаль цалкам ад іншых эўрапейскіх краінаў, геаграфічна будучы часткай эўрапейскага кантынэнту...

На жаль, мы ня можам зрабіць нашмат болей, чым працягваць палітычную ізаляцыю Беларусі, што мы і робім зараз. Мы хочам, каб Беларусь дакладна зразумела, што мы і надалей будзем працягваць палітычную ізаляцыю.

Адначасова мы хочам сказаць, і гэта вельмі істотна: мы ня сварымся зь беларускім народам, мы мяркуем, што калі б у Беларусі былі б свабодныя і справядлівыя выбары і беларусы сапраўды маглі б прагаласаваць гэтак сама, як цяпер, то мы б прызналі выбары. Гэта — нашая пасьлядоўная пазыцыя. Справа, менавіта, у справядлівасьці выбараў.

***(Паводле радыё „Свабода”. 20 верасьня)***

# БУДНІЯ ДНІ Ў ШКЛОВЕ

Усё ўжо склалася і йдзе, як некалі ў саўгасе Гарадзец. Калісьці, гадоў 10-11 таму, шклоўскі журналіст **Алесь Шчарбак** узначальваў ініцыятыўную выбарчую групу Лукашэнкі на выбарах у Вярхоўны Савет 12-га скліканьня. Але потым нешта расчараваўся і стаў у апазыцыю. Уступіў, праўда, у Сацыял-Дэмакратычную партыю і пачаў выпускаць газэту „Шклоўскія навіны”, дзе ўзяўся крытыкаваць начальства і мясцовую „вертыкаль”. Тады начальства (як звычайна пры гэтай „уладзе”)наслала на яго міліцыю. Міліцыя наскочыла і адабрала ў выдаўца (канфіскавала) аргтэхніку (кампутар, прынтар і г.д.)

Шчарбак з-за немагчымасьці перастаў выпускаць далей газэту, але не любіць начальства не пакінуў і застаўся ў апазыцыі. Міліцыі таксама аднаго рабунку здалося мала.

Аднойчы вечарам, калі спадар Шчарбак вяртаўся дадому, на яго накінулася ў цемнаце „група ў цывільным” і пачалі зьбіваць кулакамі, нагамі і нейкімі цьвёрдымі прадметамі, аж пакуль ён ня страціў прытомнасьць. Тады „цывільныя” зьбеглі.

Найбольш пабітыя ў А. Шчарбака твар, галава і рэбры. Ён ня можа рухацца і не выходзіць з дому.






***Перадвыбарчыя плякаты. Зьверху — Лукашэнкі. Надпіс па-руску: “Вызначэньне нашай будучыні”. Зьнізу — намэнклятурных дэмакратаў (“апазыцыі”). За рукі ўзяўшыся М.Чыгір, М.Марыніч, П.Казлоўскі, С.Калякін, А.Лябедзька, С.Домаш, У.Ганчарык і інш. На сьцяне іхны плякацік; напісана па-руску: “У адзінстве — сіла”.***

Гэтак жывецца ў Шклове тым, хто ня ўмее сябе паводзіць з усенароднай „уласьцю”.

***Тамаш РАКСА***

# СЬЦЯГІ Ў ГОНАР ВОРШЫ

Уначы з 7-га на 8-га верасьня, у гонар Дня Беларускай Вайсковай Славы актывісты *Маладога Фронту* правялі чарговую акцыю *„Горад — наш!”* У 46-ці гарадах Беларусі вывесілі ***150*** *Беларускіх Бел-Чырвона-Белых сьцягоў.*

Міліцыя дзяжурыла паўсюдна цэлую ноч.

У Менску *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* ўзьнялі насупраць будынкаў адміністрацыяў гарадзкіх раёнаў. Міліцыянты, што працавалі ў кругласутачным рэжыме, ня здолелі затрымаць ніводнага маладафронтаўца. Затое не лянаваліся лазіць і здымаць сьцягі (загад!). Да 10-11 гадзінаў раніцы сьцягі менская міліцыя, у асноўным, пасьпела садраць. У іншых гарадах сымвалы нацыі пратрывалі даўжэй.

***П. Я.***

# УРБАНІЗАЦЫЯ

Узровень культуры грамадзтва залежыць ад пэўных цывілізацыйных фактараў, якія выяўляюцца ў канкрэтных азначэньнях таго, чым займаецца грамадзтва, што і як вытварае, які існуе падзел і якая сувязь (камунікацыя) паміж людзьмі, якія іхныя ўяўленьні пра сьвет і пра сэнс існаваньня.

Чыньнікі грамадзкага падзелу і камунікацыі ёсьць галоўнымі

дзейнікамі паскарэньня і разьвіцьця культуры. Грамадзтва роўных людзей амаль не разьвіваецца (напрыклад, прымітыўныя супольнасьці на нізкай ступені існаваньня).

Тым часам жорсткі сацыяльны падзел без зьявы грамадзкай камунікацыі прыводзіць да застою і марнаваньня магчымасьцяў культуры, да дэградацыі.

Для нармальнага разьвіцьця камунікацыйны дзейнік культуры павінен выступаць чыньнікам грамадзкай лучнасьці, стаць спосабам гарманізацыі сувязяў і дачыненьняў людзей. Якраз тады праяўляецца паскарэньне як шлях да стабільнасьці грамадзтва. Стабільнасьць жа грамадзтва — гэта ёсьць стабільнае разьвіцьцё культуры.

***Камунікацыйнымі чыньнікамі разьвіцьця (паскарэньня) культуры трэба лічыць рэлігію, дзяржаву, пісьмовасьць, урбанізацыю, тэхніку і ў апошні час — інфарматыку.***

Пацікавімся адной з гэтых істотных зьяваў дынамікі і стабільнасьці сацыяльна-культурнага разьвіцьця — урбанізацыяй.

Мы, беларусы, гістарычна малады народ. Прыблізна тысячу гадоў таму ў нас адбыўся культурны выбух. Супала некалькі цывілізацыйных падзеяў. Практычна ў адзін і той жа час узьнiклі гарады, пісьмовасьць, дзяржава і распаўсюдзілася Хрысьціянства. За вельмі кароткі час нашыя продкі выйшлі з гістарычнага нябыту і стварылі вялікую цывілізаваную магутную дзяржаву, якая сталася ня толькі геапалітычнай, але і культурнай зьявай Эўропы.

Дынамічным чыньнікам, маторам эўрапейскай культуры былі гарады. Беларускія гарады карысталіся Магдэбурскім правам, мелі самакіраваньне і вольнае саслоўе, канцэнтравалі гандаль і рамесьніцкую вытворчасьць, былі цэнтрамі адміністрацыі і рэлігіі, станавіліся часта (што датычыць сталіцаў) духоўнымі і культурнымі цэнтрамі ўсяго народу.

Аднак, каб урухоміць цывілізацыйную ролю гарадоў на ўсё грамадзтва, патрэбна, каб існавала прадуманая ўрбаністычная сістэма сувязі паміж горадам і вёскай, спалучаная з камунікацыйнымі магчымасьцямі людзей.

У сярэднявяковай Беларусі, гэта значыць у Вялікім Княстве Літоўскім, якраз была створана і добра дзейнічала такая сістэма.

Прынцып яе заключаўся ў тым, што паміж сталіцай, вялікімі гарадамі і вёскай існавала мноства маленькіх гарадкоў — паселішчаў з сацыяльна-культурным статусам гарадзкога цэнтру. Гэта славутыя беларускія мястэчкі.

Мястэчка, як правіла, было цэнтрам мясцовай адміністрацыі і парафіі. Тут былі царква і касьцёл. У мястэчку, акрамя сялянаў, жылі гандляры, мяшчане і рамесьнікі, былі крамы, школа, аптэка, часам шпіталь ці пры боку кляштар і замак, будынкі адміністрацыі. У мястэчках існавала галоўная гандлёвая плошча і рынак. Шмат якія мястэчкі мелі самакіраваньне, магдэбургскія гэрбы і свабоднае саслоўе.

Беларускія мястэчкі, як правіла, разьмяшчаліся на адлегласьці ад 12 да 16 кілёмэтраў адно ад другога. Мы можам нядрэнна прасачыць гэтую сістэму на тэрыторыі былой Віленшчыны, дзе яна найлепш захавалася.

Пачнем адвольна, скажам, зь Дзявенішак. Праз 14 кілёмэтраў на поўдзень ад Дзявенішак — мястэчка Суботнікі; на захад ад Суботнікаў за 12 кілёмэтраў — мястэчка Геранёны з замкам і касьцёлам; за 16 кілёмэтраў на паўднёвы захад — мястэчка Ліпнішкі; за 12 кілёмэтраў на паўночны ўсход — мястэчка Трабы з царквой і касьцёлам; за 12 *км* на ўсход — мястэчка Юрацішкі; ад Юрацішак за 14 *км* на паўднёвы захад — мястэчка Іўе, а за 12 *км* на поўдзень — Лаздуны; 12 кілёмэтраў за Лаздунамі — Бакшты; за 14 *км* на захад ад Іўя — Ліпнішкі; за 12 *км* на захад ад Ліпнішак — мястэчка Тракелі, потым Воранава, Беняконі і г.д. ва ўсе канцы праз 12-14-16 кілёмэтраў ёсьць мястэчкі.

Калі пайсьці на паўночны ўсход ад Суботнікаў праз Трабы, то далей, праз 14 *км* ад Трабаў — славутае мястэчка Гальшаны з замкам і касьцёлам. Збоку — Меднікі з замкам, з другога боку — Багданава, потым — Вішнева з касьцёлам і царквой. Ідучы гэтак на паўночны ўсход праз Жупраны, Ашмяны, мы дойдзем, мінаючы шэраг мястэчак, да Астраўца, Гервятаў, Сьвенцянаў, потым да Відзаў, Дрысьвятаў, Опсы, горада Браслава, потым, праз 12 кілёмэтраў — да мястэчка Слабодка, праз 14 — да мястэчка Плюсы, далей — да Друйска, Друі, Прыдруйска і так аж да Невеля — паўночнай мяжы былога Вялікага Княства.

Гэтак жа, ці то ад Дзявенішак праз Яшуны, Салечнікі, ці то ад Гальшанаў мы праз кожныя 12-16 кілёмэтраў, мінаючы мястэчкі, дойдзем да Вільні, Лентварова ды Трокаў і потым — на Майшаголу і Няманчын.

Такая ж сістэма сягае аж да Беластоку і Берасьця. Выразна праглядваецца яна вакол Менска, Магілёва і Віцебска ды Полацка. Рэшткі яе існуюць і ў паўднёвай Беларусі вакол Пінска ды Мазыра.

Рацыянальнасьць урбаністычнай сістэмы Вялікага Княства відавочная. Кожнае мястэчка, як бачым, мела радыюс ахопу тэрыторыі 6-8 кілёмэтраў. Гэта псіхалягічна максімальная адлегласьць для пешахода, калі чалавек мог кіравацца ў дарогу пехатой, не спадзеючыся на каня. Тым часам гэта адна гадзіна язды на запрэжаным кані.

Жыхар любой вёскі ў разе патрэбы мог у любы час на працягу адной-дзьвюх гадзінаў трапіць у мястэчка. У мястэчку якраз і адбываўся культурны абмен паміж горадам і вёскай. ***Мястэчка было рэальным перадатачным зьвяном культуры.***

Паміж мястэчкам і горадам існавала рэгулярная чаўночная міграцыя і сувязь (гандлёвага, адміністрацыйнага, канфэсійнага і іншага парадку). У мястэчку і ў горадзе быў у прынцыпе аднолькавы характар культуры, толькі ў мястэчку ў меншым маштабе. (Дарэчы, і архіўныя, і археалягічныя матэрыялы добра гэта пацьвярджаюць.)

Тым часам селянін часта і рэгулярна наведваў ня горад, а якраз мястэчка, і адтуль чэрпаў свае ўяўленьні пра больш шырокі сьвет і гарадзкія дачыненьні.

Урбаністычная сістэма Вялікага Княства дала вельмі шмат для беларускай культуры. Яна забясьпечыла ёй агульнаграмадзкі эўрапейскі ўзровень і засьцерагла ад правінцыялізму. Гэта значыць ад культурнага разыходжаньня, ад бездані паміж горадам і вёскай.

Там, дзе не існавала сістэмы культуратворнай (эўрапейскай) урбанізацыі, там заўсёды прысутнічаў грамадзкі правінцыялізм. (Велічная Бухара ды Самарканд — у атачэньні жывёлагадоўчых плямёнаў з прымітыўнымі заняткамі ды ўяўленьнямі; купецкая Масква, чыноўны Пецярбург і побач, як казалі самы расейцы, — „мерзость российской действительности”.)

У Расеі не было ні вольных гарадоў, ні самакіраваньня, ні Магдэбургскага права, ні мястэчак, ні прадуманай сістэмы ўрбанізацыі. Такі стан вынікаў увогуле з неэўрапейскага характару рускага грамадзтва. У пачатку XX-га стагоддзя ў Расеі існавала велізарная культурная розьніца паміж горадам і вёскай. Бальшавікі паставілі задачу ліквідаваць гэтую бездань. І ліквідавалі па-свойму: разбурылі вёску і зьнішчылі сялянства. (Набудавалі таксама непатрэбных савецкіх гарадоў, у якіх немагчыма жыць.)

На Беларусі яны першым чынам ліквідавалі саму назву „мястэчка”. Перайменавалі мястэчкі то ў „дзярэвні”, то ў „гэпэ” („гарадзкія пасёлкі”). Расейцы моцна дэфармавалі функцыі беларускага мястэчка, шмат якія мястэчкі давялі да поўнай дэградацыі, але зьнішчыць дазваньня ўсё ж не пасьпелі.

Урбаністычная палітыка расейскіх камуністаў на Беларусі заключалася ва ўкараненьні такой мадэлі, якая б стымулявала працэсы русіфікацыі беларусаў і міграцыі расейцаў у Беларусь. Зыходзячы з гэтай задачы, у пачатку 60-х гадоў, на закрытым паседжаньні ЦК КПСС у Маскве было прынятае рашэньне аб разбудове Менска ў вялікі мегаполіс з шматмільённым насельніцтвам.

Потым, у 1964 годзе, узьнік плян ліквідацыі на Беларусі вясковых паселішчаў. Дзеля гэтага быў прыдуманы тэрмін „неперспэктыўная вёска”. 73 адсоткі беларускіх вёсак намерваліся ліквідаваць, сьцерці з твару зямлі.

Гэты плян ужо ня меў дачыненьня да ўрбанізацыі. Адкрыта рыхтавалі культурную катастрофу і вынарадаваньне беларускай нацыі.

Мы, беларусы, павінны быць удзячныя Богу, што своечасова распаўся Савецкі Саюз.

Дбаючы пра нашу будучыню і нашу культуру, мы мусім будзем шмат што адбудаваць, адрадзіць, аднавіць; у тым ліку вярнуцца да культуратворчай сістэмы ўрбанізацыі, абумоўленай інтарэсамі нашага грамадзтва, дабром нашых людзей, эканомікай, экалёгіяй і культурнай пэрспэктывай. ***Мы павінны будзем адрадзіць нашыя мястэчкі.***

Беларуская гісторыя нам штодзённа сцьвярджае і сьведчыць, што наша нацыянальная будучыня знаходзіцца ў нас самых. Мы, і толькі мы, беларусы, мусім яе ажывіць і ўсталяваць на нашай зямлі.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***кандыдат мастацтвазнаўства***

*15 лютага 2001 г.*
*Нью-Ёрк*

# НАСТАЎ ВЕРАСЕНЬ — ЗНОЎ ПАЧАЛОСЯ

З пачаткам заняткаў пачынаецца атака на Беларускі Гуманітарны Ліцэй у Сьветлагорску. Чаго толькі ні было. Дзеці, настаўнікі і бацькі змагаюцца за права вучыцца па-беларуску. Рэжым, аднак, надта ня хоча, каб беларусы вучыліся па-свойму. Вось і ў гэтым годзе прыдумалі. Аддзел адукацыі Менгарвыканкама раптам узяў і спыніў фінансаваньне Ліцэю.

Аднак, ня гледзячы на адсутнасьць фінансаваньня, занаткі ў Ліцэі працягваюцца. Выкладчыкі ў Ліцэі працуюць бясплатна. Не жадаюць пераходзіць у сярэднюю школу №1 і ліцэісты, хаця гарадзкія ўлады пазбавілі іх прадугледжаных заканадаўствам бясплатных школьных абедаў.

***Каця Сідарава***, якая трэці год вучыцца ў ліцэі, сказала, што для яе вярнуцца ў сярэднюю школу №1 азначае зьвесьці на нішто ўсе свае намаганьні за папярэднія два гады. Яна ведае, што пасьля вучобы ў школе №1 не паступіць у ніводзін прыстойны ўнівэрсітэт.

Тымчасам Гарвыканкам зьвярнуўся ў пракуратуру з патрабаваньнем даць прававую ацэнку загаду аддзелу адукацыі пра спыненьне фінансаваньня Ліцэю, а навучэнцы і выкладчыкі пачалі пратэставаць у пікетах. Тады міліцыянты сталі запалохваць ліцэістаў пакараньнем за акцыі пратэсту. Гэтым заняўся інспэктар па справах непаўнагадовых сп.**Зізятка.** І пайшло-паехала, задрузгацела ў краіне паранойі...

***Антось ВОЗЕРА***

# ДЗЕНЬ СЬЦЯГА І ПАГОНІ

*19 верасня споўнілася дзесяць гадоў ад урачыстай хвалюючай даты ў гісторыі Беларусі — зацьвярджэньня Вярхоўным Саветам нацыянальнага Бел-Чырвона-Белага Сьцяга і гэрба Пагоня ў якасьці дзяржаўных сымвалаў Рэспублікі Беларусь.*

*Тыя, хто рыхтавалі законапраект і адстойвалі яго ў Вярхоўным Савеце (а гэта найперш дэпутаты Апазыцыі БНФ) сутыкнуліся зь лютым супрацівам з боку значнай часткі камуністычных дэпутатаў, і асабліва так званых „ветэранаў”. Фронтаўцам трэба было іх пераканаць і перацягнуць на свой бок.*

*Цяперака, напярэдадні 10-годдзя гэтае даты, журналісты задалі некалькі кароткіх пытаньняў вядомым людзям.*

***Сяргей Навумчык:*** „Адразу, пасьля абвяшчэньня незалежнасьці 25 жніўня, уся праца дэпутатаў *Апазыцыі БНФ* у Вярхоўным Савеце была накіраваная на тое, каб парлямант зацьвердзіў нацыянальныя сымвалы ў якасьці дзяржаўных. Тады *Старшыня Апазыцыі Зянон Пазьняк* правёў перамовы з найбольш уплывовымі дэпутатамі зь ліку ветэранаў і камуністаў. Іншыя нашы калегі таксама вялі перамовы з дэпутатамі.

У фае Дома ўраду была наладжаная выстава „*Гісторыя Пагоні і Бел-Чырвона-Белага Сьцяга”*. Вялікія стараньні выяўлялі мае калегі, дэпутаты *Ю. Беленькі, Л. Баршчэўскі, А. Трусаў, В. Голубеў,* практычна, усе 30 дэпутатаў *Апазыцыі БНФ.*

Былі два спрыяльныя фактары па-за межамі Вярхоўнага Савета, якія я цяпер магу нагадаць. Першае — гэта настрой грамадзтва, рашучая прага людзей да пераменаў, і другое — адсутнасьць уплыву Масквы. Расея, Масква тады займаліся сваімі справамі.

І вось калі мы кажам часам, што каталізатарам аднаўленьня незалежнасьці ў жніўні 1991 года былі падзеі ў Маскве (правал путчу), то зацьверджаньне *Пагоні* і *Бел-Чырвона-Белага Сьцягу* — гэта цалкам беларуская палітыка. Масква тут ня здолела перашкодзіць.”

***Зянон Пазьняк:*** „У маім жыцьці гэта быў найвялікшы дзень. Бадай, пасьля вяртаньня незалежнасьці, гэта была найважнейшая і самая хвалюючая падзея і найцяжэйшая задача: зацьвердзіць *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* і *гэрб Пагоня* ў якасьці дзяржаўных сымвалаў. Мы разумелі тады ў парляманце, што калі мы гэтыя сьцяг і гэрб зацьвердзім, калі ў нас будуць дзяржаўныя сымвалы, гэта значыць, што нашая незалежнасьць стане на моцны грунт, што яна будзе. Мы разумелі, што такое для дзяржавы сымвалы, і мы вельмі рыхтаваліся.

Фронтаўскія мастакі зрабілі выставу ў фае Вярхоўнага Савета пра гісторыю беларускага гэрба і сьцяга, бо большасьць дэпутатаў дрэнна арыентавалася ў гісторыі. Мы падрыхтавалі ад *Апазыцыі Фронта* шмат дакладаў. Выступаць павінны былі амаль усе. Папярэдне мы гаварылі зь іншымі паважанымі дэпутатамі, з рознымі людзьмі і былі ўпэўненыя, што ўсё адбудзецца пасьпяхова.

Але адразу здарылася нечаканасьць. У самым пачатку паседжаньня Вярхоўнага Савета выступіў адзін вельмі паважаны дэпутат (ніхто з нас зь ім асаблівай гутаркі не праводзіў, бо былі ўпэўненыя ў ім). Ён нечакана накінуўся з крытыкай на камуністаў, на тых, якія казалі, што „ім ба толькі флажкі”. А іх жа большасьць была ў зале.

Мы аслупянелі ад нечаканасьці. Я бачу, што ўся гэтая камуністычная публіка проста разьярылася: вочы гараць, злосныя, крычаць. Пачалі яго зганяць з трыбуны. Стала зразумела, што ўсё, канец, — катастрофа. Гэта было жахліва. У мяне, памятаю, аж далоні сталі вільготнымі.

Першае, што я зрабіў, — напісаў запіску *Станіславу Шушкевічу* ў Прэзыдыюм, што здымаю сваё выступленьне. Бо зразумеў, што ў гэтай сітуацыі мне ня варта выступаць. (Артадоксам трэба было адразу сарваць злосьць, а тут — іхны галоўны апанэнт...) Патрэбны былі выступы ў нашу карысьць, але больш нэўтральных людзей, і пажадана — зь іхнага асяроддзя, каб яны супакоіліся.

Потым я абышоў (тут жа, у зале, бо трэба было дзейнічаць імгненна) усіх сяброў, дэпутатаў *Апазыцыі БНФ,* і сказаў, каб тэрмінова карэктавалі выступы і тэматыку, бо неабходна псіхалягічна выправіць і згладзіць канфліктную сітуацыю ў залі. (Мы ведалі характар і матывы паводзінаў бальшыні нашых „заканадаўцаў”.)

Першым я папрасіў выступіць *Алега Трусава*. Ён добра выступіў. Заля крыху супакоілася. І так дзесьці да паловы абмеркаваньня ішла вось гэтакая пазыцыйная барацьба розуму і нэрваў, выступленьні з чыста псіхалягічнымі задачамі.

Вельмі дапамог тады *Георгі Таразевіч*. (Папярэдне мы гаварылі зь ім і ведалі ягоную думку.) Ён выступіў добра і заклікаў зацьвердзіць нацыянальную сымволіку ў якасьці дзяржаўнай. Камуністы не маглі не ўлічыць ягоную пазыцыю і аўтарытэт. Але я бачыў і адчуваў, што галасоў мы не набяром (бо трэ’ было дзьве трэці). Тады я ізноў напісаў запіску С. Шушкевічу (які, дарэчы, вельмі добра праводзіў якраз гэтае паседжаньне) і папрасіў, каб ён прадоўжыў дыскусію, а сам пабег у фае і патэлефанаваў *Прэзыдэнту Акадэміі Навук Платонаву* і папрасіў, каб ён тэрмінова прыехаў выступіць на сэсіі: патрэбна было аўтарытэтнае акадэмічнае выступленьне. (З Шушкевічам было дамоўлена, ён сам гэта прапанаваў.) Платонаў прыехаў своечасова і выступіў, таксама вельмі добра і пераканаўча.

Пачалі галасаваць. Не набіралі, здаецца, 1-2 галасы. Некалькі разоў рабілі перапынкі, падыходзілі з розных бакоў, прапаноўвалі розныя

варыянты і папраўкі. (Зноў нехапала 1-2 галасы.) І, нарэшце, вычарпалі ўсё. І вось апошняе галасаваньне. Хваляваліся незвычайна. Я ніколі ў жыцьці не адчуваў сябе ў такім стане, як пад электрычным напружаньнем. І тады мы вылучылі найбольш аўтарытэтных дэпутатаў з *Апазыцыі Фронта* і сказалі сабе, што трэба йсьці і проста прасіць тых, якія будуць (зразумелая рэч) галасаваць „супраць”, прасіць прагаласаваць „за”. Мы прасілі.

Я памятаю, падыйшоў да ветэрана-камуніста *Міхаіла Дзімітравіча Жукоўскага* і проста яго папрасіў. Кажу: „Міхаіл Дзімітравіч, нацыянальная дзяржава вышэй усялякай ідэалёгіі. Калі мы ня будзем яе мець, ня будзем мець яе нацыянальных сымвалаў, то мы ня будзем мець нічога. Мы станем нічым. Я вельмі Вас прашу... Адзін раз у жыцьці”. І ведаеце што, ён паабяцаў (і прагаласаваў „за”). Вось гэтакая ішла барацьба на чалавечым узроўні.

Нарэшце — галасуем. У зале поўная цішыня. Калі табло паказала вынік, я ўпершыню ў жыцьці на секунду страціў прытомнасьць. Самлеў: такое было нэрвовае напружаньне. Бо трэба было набраць 231 голас. І табло паказала 231.

Потым цяжка было апамятацца. Мяне тут жа пацягнулі выступаць на плошчу. А я ня мог гаварыць, таму што цяклі сьлёзы.

Так што гэты Сьцяг стаў часткай майго жыцьця, майго лёсу, маёй натуры, і ня толькі маёй, — усіх нас, дэпутатаў *Народнага Фронту*, якія тады былі ў парляманце. Гэты дзень, я думаю, кожнаму з нас запомніцца на ўсё жыцьцё.

Ужо вечарам над Домам ураду лунаў *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.*”

***Міхась Чарняўскі:*** „У чалавечай сьвядомасьці, у гістарычнай памяці ёсьць такія сымвалы, якія абагульняюць усё, што ёсьць, і ўсё мінулае, тое, што пражылі людзі. У гэтых сымвалах зьмяшчаецца сутнасьць духоўнага сэнсу нацыі ці супольнасьці людзей. Як, напрыклад, у хрысьціянаў — гэта Крыж, увасабленьне ўсёй Хрысьціянскай веры. Так у кожнага народа старажытны гэрб ягонай дзяржавы — гэта ўвасабленьне ягонай ўсёй гісторыі. І вось у нашай *Пагоні* якраз зьмешчана ўвасабленьне ўсёй нашай тысячагадовай гісторыі.

Беларус, які верыць *у Пагоню*, гэта ўжо сапраўды — беларус, несумненна, і надзейны беларус. Хоць ён можа і ня ведаць асаблівасьцяў і дэталяў беларускай гісторыі.

Калі хочуць зьнішчыць народ, задушыць ягоны дух, то перш-наперш стараюцца зьнішчыць ягоны сымвал. Гэта невыпадкова.

Я памятаю эпізод, калі паднялі над Домам ураду *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.* Паднялі яго вечарам і адразу пасьля прыняцьця Закону. Назаўтра вельмі рана (яшчэ быў пусты горад, але мэтро ўжо хадзіла) я выходжу на пляц *Незалежнасьці* і бачу *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* над Домам ураду. Гэта для мяне было нешта незвычайнае.

Я іду па пустой плошчы і бачу: наўскасяк таксама ідзе — хто б вы думалі — Зянон Пазьняк. І мы зь ім абняліся.

Я ня ведаю, як там ён трымаўся, ну а я трошкі расплакаўся ад гэтай падзеі.”

***Васіль Быкаў:*** „Вядома, што нацыянальная сымволіка, — атрыбут нацыі, якая ідэнтыфікуе сябе такой. Сьцяг і гэрб не ствараецца пад кожны палітычны момант ці пад пэўнага ўладатрымальніка. Яны вечныя і спрадвечныя. Калі ж на пачатку трэцяга тысячагоддзя ад нараджэньня Хрыстовага ў якой нацыі няма гэтай сымволікі, дык няма і нацыі. І наўрад ці ўжо будзе.

Шчасьце беларусаў палягае ў тым, што гэткая сымволіка ў нас ёсьць, яна дайшла да нас з сівой даўніны. Але яе ў нас скралі, нахабна абрабавалі нацыю, што яшчэ горай, яшчэ страшней за эканамічны рабунак і параўнальна, хіба, з нацыянальным генацыдам.

Ужо адно гэта (ня кажучы пра рабунак свабоды) робіць рабаўнікоў злачынцамі, злачынцамі перад нацыяй. Нават калі яны спрабуюць падмяніць, падкласьці замест сьвятыні — фальшыўку і патрабаваць павагі, як да сьвятыні, гэта ўжо падвойнае злачынства: перад нацыяй, перад гісторыяй і перад Хрысьціянскай маральлю, таксама абрабаванай рабаўнікамі.

Цяпер, калі вялікае няшчасьце спасьцігла амэрыканскі народ, сьвет убачыў, як кінуліся амэрыканцы да свайго зорна-паласатага сьцягу.

Сымвалічна, што менавіта ў тым амэрыканскім сьцягу пазнаюцца і блізкія нам элемэнты гнанае непрыяцелямі нашай беларускай сьвятыні. У нашым сьцягу — наша спадзёўка, наша (хай сабе яшчэ ня надта ўсьвядомленая нацыяй) надзея.”

***Івонка Сурвіла:*** „Беларусы ў ва ўсім вольным сьвеце жывуць пад знакам *Бел-Чырвона-Белага Сьцягу* і *Пагоні.* Для нас іншых нацыянальных сымвалаў няма і ніколі не было. У нашых памешканьнях, ва ўсіх беларускіх цэнтрах *Пагоня* і *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* займаюць ганаровае месца. А ў Таронта, найвялікшым горадзе Канады, *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* вывешваецца ўладамі на плошчы перад гарадзкой управай у цэнтры гораду кожны год *25 Сакавіка — у Дзень нашага найвялікшага нацыянальнага сьвята.* І нашыя людзі зьбіраюцца там, каб пацешыць сэрца, гледзячы на наш прыгожы *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.*

Дзесяць гадоў таму мы паверылі ў незалежнасьць Беларусі толькі тады, калі гэтыя сымвалы — *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* і *Пагоня* — сталіся дзяржаўнымі сымваламі Беларусі.”

***(Паводле эфіру радыё „Свабода”)***

# АРЫШТАВАЛІ ВЕРШЫ

23 верасьня на польска-беларускай мяжы ў Берасьці лукашэнкаўскія мытнікі затрымалі ў цягніку дацэнта Беларускага Дзяржаўнага Палітэхнічнага Ўнівэрсітэту спадара ***Міколу Анцыповіча*** і канфіскавалі ў яго два асобнікі *кнігі фота-вершаў* ***Зянона „Глёрыя Патрыя”***, якія падараваў яму аўтар. На пытаньні спадара Анцыповіча „чаму”, „як так можна” і „на якой падставе”, мытнік **Кузьміч** зачытаў нейкія пастановы і даводзіў, што гэтая кніга, „не подлежащая ввозу” і яшчэ нешта пра „вред и опасность”.

Які „вред” і „опасность” у вершах пра прыроду і пачуцьці, мытнік патлумачыць ня здолеў, але сказаў, што спадар Анцыповіч можа адмовіцца ад „груза”, альбо зьнішчыць кніжку ў прысутнасьці мытнай службы. А паколькі спадар Анцыповіч, натуральна, мытніка не разумеў, то вершы канфіскавалі, а заадно і 50 *асобнікаў „Беларускіх Ведамасьцяў”,* якія на мяжы канфіскуюць рэгулярна, нават у адным асобніку.

Спадар Анцыповіч зьбіраецца падаваць на лукашэнкаўскую мытню ў лукашэнкаўскі суд.

Разумнага растлумачэньня прычынаў канфіскацыі вершаў тут не відаць. Проста працягваецца паляваньне на імя *Зянона Пазьняка* на ўсё, што зь ім зьвязанае.

***Галіна ПАЛАЧАНІНА***

# ІДЗЕ ЗМАГАНЬНЕ

Працягваецца змаганьне супраць зьнішчэньня ***Курапатаў***. Падобна на тое, што пачынаецца час, калі трэба будзе ратаваць кожны сантымэтр Беларусі, кожны мілімэтр Беларускага. Як высьвятляецца, пашыраць дарогу праз *Курапаты* ўзяліся без патрэбных узгадненьняў праекту (што зьяўляецца крыміналам) і без адпаведных разьлікаў магчымых затрат. Рэжым, відаць, вельмі сьпяшаецца. Тым часам вядома, што існуюць праекты правядзеньня дарогі ў абход *Курапатаў.* Гэтыя праекты лепшыя, бо не закранаюць мартыралягічны помнік, і прытым таньнейшыя па затратах. Аднак, відаць, загадана было брацца менавіта за „варварскі” праект.

*Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* патрабуюць спыніць будаўніцтва дарогі праз *Курапаты* і весьці яе ў абход. 6-га жніўня пра гэта быў адасланы ліст у Савет Міністраў. 25 верасьня (паколькі адказу Партыя не

атрымала) пасланы паўторны ліст у Саўмін з тым жа патрабаваньнем спыніць злачынныя пляны „будаўнікоў” і будаўніцтва дарогі праз *Курапаты.*

Сакратар *Управы Сойму Фронта* ***Алесь Чахольскі*** зьвярнуўся праз друк да грамадзянаў Беларусі з наступным заклікам:

*“Шаноўныя людзі! 29-га кастрычніка 2000 года Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ і Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне” на Дзяды ўсталявалі дзясяткі крыжоў на магілах закатаваных ахвяраў бальшавізму. Але гэтага недастаткова, бо, як вядома, там жа сотні пахаваньняў. Як ніколі, актуальны сёньня заклік Зянона Пазьняка, які ў свой час адкрыў праўду пра Курапаты: „У Курапатах, дзе над магіламі расстраляных беларусаў вырас лес дрэў, хай вырасьце лес рукатворных крыжоў, якія прынясуць сюды жывыя беларусы, каб усе памяталі пра генацыд і каб жыла Беларусь”.*

*Мы з вамі павінны гэтыя крыжы ўсталяваць. Гэта наш сьвяты абавязак — стварыць народны мэмарыял у памяць ахвяраў бальшавіцкіх рэпрэсіяў. Як Хатынь стала сімвалам фашысцкага генацыду, так Курапаты павінны стаць сімвалам камуністычнага генацыду супраць народу. З розных вёсачак, мястэчак, гарадоў Беларусі чорныя „варанкі” вывозілі людзей у Курапаты і ГУЛАГі, і мы маем маральнае права на крыжах усталяваць шыльды з назвамі гэтых паселішчаў. Іх шмат, вельмі шмат...*

*Кожны можа вырабіць крыж, прывезьці яго ў Курапаты і ўсталяваць тут.*

*Прашу Вас, дарагія грамадзяне, зьвяртацца ва Ўправу Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ па адрасу: Менск, праспэкт Ф. Скарыны, 133, кв.147 і па тэлефоне 8(029) 602-16-18.*

*Можна прыносіць на выраб крыжоў ахвяраваньні.*

*Запрашаю беларускі бізнэс і прадпрымальнікаў прыняць чынны ўдзел у сьвятой справе.*

Акрамя *Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ,* на заклік *спадара Чахольскага* з усіх арганізацыяў адклікнуліся пакуль толькі хлопцы з *Маладога Фронту* і асобныя грамадзяне. Маладафорнтаўцы наладзілі дзяжурствы ноччу на месцы будаўніцтва і ўключыліся ў справу ўсталяваньня памятных крыжоў.

23, *28* і *29 верасьня Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ, маладафронтаўцы і грамадзяне Менска* наладзілі талаку *ў Курапатах* і ўстанавілі ў гэтыя дні некалькі дзясяткаў крыжоў, запалілі сьвечкі і зьнічы паабапал дарогі.

Фронтаўцы спадзяюцца, што ініцыятыва змаганьня за захаваньне *Курапатаў* будзе пашырацца. Зафіксаваныя ўжо пэўныя зрухі сярод дэмакратаў (нават абʼявілі аб стварэньні камітэту ў абарону *Курапатаў*). Удзельнічаюць ў абароне таксама сябры *Мартыралёгу Беларусі,* археолягі, цікавяцца журналісты.

*Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Фронт* пачалі адначасна рыхтавацца да *Дзядоў у Курапатах.* Бо ўсе разумеюць, што каб уратаваць *Курапаты* ад лукашысцкага рэжыму, патрэбнае грамадзкае рушэньне, і нават падтрымка міжнароднай супольнасьці.



***Курапаты. 29 кастрычніка 2000 г. Удзельнікі Крыжовага шэсьця (Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ і Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”)***

***Марʼян ВАНЬКЕВІЧ***

# АБ ПАЗЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАГА РУХУ

*(Заява)*

Фальсіфікацыя выбараў прэзыдэнта Беларусі, якія адбыліся 9-га верасьня гэтага года, стала рэальным вынікам палітыкі расейска-нямецкага ўзаемадзеяньня на Беларусі.

Гэтая фальсіфікацыя і выбарчы падлог падвялі рысу пад апазыцыйнай актыўнасьцю старой (кебічаўскай) намэнклятуры і калябаранцтвам зь ёй рознага роду „дэмакратаў-прагматыкаў”.

Беларусы ніколі ня пойдуць за старой камуна-савецкай намэнклятурай, супраць якой змагаліся.

Намэнклятурная апазыцыя і яе кандыдаты, выстаўленыя на прэзыдэнта, не былі і не маглі быць палітычнай альтэрнатывай рэжыму і ягонай антыбеларускай палітыцы. Ніхто не забыўся, што яшчэ нядаўна яны вялі народ да камунізму і потым супрацоўнічалі з Лукашэнкам. Цяпер працягваюць супрацоўнічаць з Масквой.

Намэнклятурная апазыцыя разам з „дэмакратамі”, кіраўніком Місіі АБСЭ Гансам Вікам і так званымі „незалежнымі” СМІ, дамогшыся аслабленьня і расколу *Беларускага Народнага Фронту*, перахапілі ініцыятыву перад выбарамі ў беларускага Адраджэньня і сваімі безыдэйнымі згодніцкімі дзеяньнямі паспрыялі татальнай фальсіфікацыі выбараў Лукашэнкам.

На іх кладзецца адказнасьць за няшчасьце і трагедыю Беларусі.

Мы адзначаем, што на сёньняшні дзень у Беларусі існуюць дзьве апазыцыі дыктатарскаму рэжыму: унутраная, спалучаная з дэмпартыямі, намэнклятурная апазыцыя (цяпер — рэшткі яе) і агульнанацыянальная, нацыянальна-вызвольная апазыцыя (*Беларускі Вызвольны Рух*), у аснове

якой — *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ.*

*Народны Фронт* і *Партыя БНФ* ставяць задачу грамадзкага і палітычнага змаганьня з дыктатарскім антыбеларускім рэжымам за свабоду і гарантыі разьвіцьця беларускай нацыі, за ўмацаваньне незалежнасьці Беларусі, за праўную дзяржаву, справядлівасьць і дэмакратычны лад.

Асноўным зьместам нашай цяперашняй дзейнасьці мы лічым ***прынцып беларускай салідарнасьці***. Гэта значыць: аб'яднаўчае змаганьне супраць рэжыму акупацыйнай дыктатуры, зыходзячы з галоўных каштоўнасьцяў беларускай нацыі, жыцьцё якой апынулася пад пагрозай.

Галоўнымі каштоўнасьцямі нацыі мы лічым *дзяржаўную незалежнасьць, беларускую мову і беларускую маёмасьць (уласнасьць).* Гэтыя каштоўнасьці мы найперш павінны абараняць, бо гэта грунт, на якім існуе нацыя, свабода і дабро народа.

Якраз цяпер актывізаваўся агульнарасейскі наступ па захопу беларускай маёмасьці. Мы цьвёрда верым у перамогу справядлівай Беларусі і папярэджваем, што як толькі будзе ўсталяваная легітымная ўлада ў Беларусі, *усе расейскія дамовы і правы на беларускую маёмасьць, прыдбаныя пры нелегальным рэжыме Лукашэнкі, будуць анулявaныя.*

У межах палітычнай канцэпцыі *беларускай салідарнасьці*, акрамя агульных прыярытэтаў (дзяржаўнай незалежнасьці, беларускай мовы і нацыянальнай уласнасьці) мы засяроджваем сваю дзейнасьць таксама на такіх аспэктах абароны беларускага грамадзтва, як Чарнобыль (праблемы чарнобыльскага генацыду), Курапаты (сьведчаньні фізічнага зьнішчэньня беларускай нацыі) і Зямля (праблемы зямлі і небясьпека страты нацыянальнай уласнасьці на зямлю).

Палітычная і грамадзкая дзейнасьць *Партыі БНФ* і *Фронту* будзе канцэнтравацца па чатырох асноўных накірунках: палітычна-асьветніцкім, арганізацыйна-партыйным, інфармацыйным і салідарным.

*Салідарны* аспэкт працы прадугледжвае стараньні па кансалідацыі ўсіх беларускіх адраджэнцкіх сілаў і накірункаў.

Мы заклікаем усіх беларусаў, якім дарагая незалежнасьць Беларусі, беларуская мова, наша зямля, тэрыторыя і багацьце, створанае беларускім народам, наш сьвяты *Бел-Чырвона-Белы беларускі сьцяг* і *гэрб Пагоня,* аб'яднoўвацца ў беларускую салідарнасьць, у кааліцыю беларускага Адраджэньня, вяртацца ў Беларускі Народны Фронт.

Мы стаім на пазыцыі непрызнаньня сфальшаваных выбараў прэзыдэнта, якія адбыліся 9-га верасьня гэтага года. Мы дамагаемся адмены вынікаў гэтых несправядлівых выбараў і правядзеньня новых свабодных дэмакратычных выбараў пад кантролем і пратэктаратам міжнародных арганізацыяў, удзельнікам якіх зьяўляецца Рэспубліка Беларусь.

***Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

*22 верасьня 2001г.*
*Менск*

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Вялейская турма*

*(Жменя ўспамінаў)*

*Гэтыя ўспаміны Алеся Маханеўскага мы перадрукоўваем з газэты „Бацькаўшчына" (1948, 25 сакавіка). Гаворачы пра зьверствы расейскіх бальшавікоў на Беларусі, мы не павінны забываць, што паводзіны нямецкага фашыстоўскага зьвяр'я нічым не адрозьнiваліся. Забіваючы беларусаў, яны супольна супрацоўнічалі. (Рэдакцыя).*

* * *

Праца гісторыкаў нашае мартыралёгіі будзе досыць цяжкая, бо ўсялякія дакументы зьнішчаныя ворагам уцякаючы, а з турмаў і канцэнтрацыйных лягераў мала каму з нашых людзёў давялося выйсьці жывымі. Дый мінулыя мукі й перажываньні ці адзін важны факт або прозьвішча зацерлі.

Вялейская турма! Яна застанецца ў гісторыі нашага народу як сымвал Гальготы змаганьня з усімі нашымі акупантамі. Побач з навагрaдзкай, гарадзенскай, віленскай, баранавіцкай і беластоцкай, яна была сьведкаю не аднэй, а сотняў і тысячаў людзкіх трагедыяў. За нямецкай акупацыяй яна, побач зь менскай турмой, была найжудасьнейшай.

У 1941 г. бальшавікі, уцякаючы, падпалілі яе, і яна чыста згарэла. Пры турме застаўся толькі малы арышт зь 10-цьма камэрамі: 4-ма вялікімі і 6-ма адзіночкамі. Новыя „гаспадары" Беларусі, ня маючы часу ставіць другую турму, выкарыстоўвалі толькі гэты арышт, называючы яго „новай турмой". Аўтару гэтых радкоў давялося праседзець у ёй блізу год і за гэты час перажыць 18 вялікіх экзэкуцыяў.

Арышты сярод жыхарства вялейскай акругі пачалі неўзабаве пасьля таго, як прыйшлі немцы. У кожным мястэчку была мясцовая нямецкая „ортскамандатур", што праводзіла арышты й экзэкуцыі сама. Як прыехала нямецкая цывільная ўлада, а зь ёй разам і жандармэрыя, гэтая функцыя перайшла да апошняй.

Трэба заценіць, што найстрашнейшы тэрор настаў месяцаў колькі пасьля, калі ў студзені 1942 году ў Вялейку прыехала СД на чале з „унтэрштурмфюрэрам" Гравэ. Пачаліся масавыя арышты сярод жыхарства, а экзэкуцыі адбываліся за 200 мэтраў ад турмы. Асаблівым зьверствам адзначаліся працаўнікі СД: Ганін, Дымпэран, Зыдлер, Якабсон, Шаранговіч.

Дзень або два перад экзэкуцыяй вязьні мусілі самы капаць сабе магільную яму, шырыня, глыбіня й даўжыня якой залежалі ад дапушчальнай колькасьці людзёў, што меліся быць расстраляныя.

На пачатку свае дзейнасьці вялейскае СД брала на экзэкуцыю толькі з турмы, пасьля (асабліва ж у канцы 1943 г.) расстрэлы адбываліся ў сёлах або ў мястэчках, там, дзе былі схопленыя „вінавайцы".

У ліпені 1942 г. быў створаны пры вялейскім СД „сьледчы аддзел", на чале якога стаяў расеец, белагвардзейскі палкоўнік Перамыкін. Тэрор, дзякуючы Перамыкіну й ягоным агентам (на вялікі сорам трэба прызнацца, і нясьведамым або абруселым беларусам), яшчэ павялічыўся. Пачалося масавае паленьне сёлаў у адказ на беларускі рух адпору. Вялейская турма была перапоўненая.

Вось колькі дадзеных за 1943 год:

Турма была аблічаная на ***60-70*** чалавекаў, сярэдня ж у ёй было ***300-350*** чалавекаў. У часе экзэкуцыяў 14 лютага 1943 г. было расстраляна 58 чалавекаў, 13 сакавіка 1943 г. 47 чалавекаў. Адна з найстрашнейшых экзэкуцыяў была 4 красавіка 1943 г., калі загінула больш за ***70*** чалавекаў, пераважна сялянаў з маладэчанскага павету.

11 красавіка 1943 г. было расстраляна за спробу ўцёкаў з турмы ***18*** чалавекаў, між іх — пастар эвангельскае царквы баптыстых ***Нядзьвецкі*** з Радашкавічаў.

17 красавіка 1943 г. яшчэ дадаткова за тую ж самую віну — ***7*** чалавекаў.

10 траўня 1943 г. расстралялі каля ***50*** чалавекаў.

У турме ў другой палавіне травеня 1943 г. зьявіўся плямісты тыфус. Тады начальнік СД загадаў усіх хворых расстраляць, а здаровым зрабіць дэзынфэкцыю. Гэтак 22 траўня 1943 г. загінула каля ***80*** чалавекаў.

Перамыкінавы агенты, дастаўшы гадавік беларускай савецкай газэты *„Сялянская Газэта"*, што выходзіла за бальшавіцкімі часамі ў Вялейцы, нумар па нумары праглядалі й выпісвалі прозьвішчы й адрасы людзёў, якія пісалі ў газэту, або аб якіх газэта добра адгуквалася. Сьпісы пасьля йшлі да Перамыкіна, а той праводзіў арышты. У ліпені 1946 г. у вялейскай турме загінула каля ***80*** чалавекаў, ахвяраў гэтае акцыі, а сярод іх: Наркавіч, Пястун, Каляда, Сіротка, настаўнік Баслык, Верамей і шмат іншых.

У жнівені 1943 г. адбылася г.зв. „валожынская акцыя СД", у часе якой каля ***60*** чалавекаў было расстраляна на месцы, а гэтулькі ж прывезена ў турму.

17 верасня 1943 г. адбылася найбольшая за маімі часамі экзэкуцыя. Загінула каля ***100*** чалавекаў, а спасярод іх *2 рымска-каталіцкія ксяндзы з Валожынскага павету*, былы заступнік народнага камісара камунальнае гаспадаркі Летувіскае ССР інжэнер ***Анатоль Гродніцкі*** й шмат іншых.

4-га лістапада 1943 г. былі публічна павешаныя ***2*** вязьні вялейскае турмы: ***Маліноўскі*** й ***Жоўтка***, вучні вялейскае настаўніцкае сэмінарыі. Гэта была рэпрэсія за выбух бомбы ў сэмінарскім будынку, які меўся быць апаражнены для войска.

У лістападзе 1943 г. блізу ***200*** вязьняў вялейскаае турмы былі вывезеныя ў нямецкія канцэнтрацыйныя лягеры. Зь іх толькі адзін, мабыць, застаўся ў жыцьці — аўтар гэтых радкоў. Ужо ў першых месяцах канцэнтрацыйнага лягеру памерлі, між іншых, ***Гулевіч Мікалай***, ***Альфэр Юстын***, ***Гайлевіч***, ***Мамай***, ***Сіманаў***, ***Радзевіч Сьцяпан***, ***Гудоўскі***.

Пішучы пра вялейскую турму й ейных „жыхароў", нельга ня ўспомніць пра сьвятой памяці ***Пётру Родзевіча*** й сьвятой памяці ***Галяка Івана*** (арыштаваны 22 сакавіка 1943 г.). *П. Родзевіч* праседзеў у турме больш за год у жудасных абставінах. Вялейшчына шмат заўдзячвае сьвятой памяці *П. Родзевічу*, ці то як школьнаму працаўніку, ці як адміністратару. Адданасьць нацыянальнай справе, ахвярнасьць, вялікі патрыятызм, адвага й просталінейнасьць — вось характэрныя ягоныя рысы. Як сябра беларускай нелегальнай арганізацыі, ён шырака вядзець антынямецкую працу. Гэта была душа ўсяго беларускага ў Вялейшчыне. Выдадзены немцам прадажнымі агентамі СД, адзін зь якіх ужо дастаў, хоць і ня з тых рук, але заслужаную кару. *Сьвятой памяці Пётра Родзевіч*, дармо, што яго нялюдзка катавалі, ня выдаў нікога з сваіх аднадумцаў. У красавіку 1944 году ён быў жыўцом спалены немцамі ў сяле Порса ля Вялейкі.

*Сьвятой памяці* ***Іван Галяк***, працаўнік адміністрацыі, арыштаваны ў ліпені 1943 г. за перахоў жыдоў. Тры месяцы праседзеў у карнай камэры вялейскай турмы, дзе наогул абставіны былі немагчымыя. Дзякуючы шчасьцю, выйшаў з турмы пасьля паўгадовага зьняволеньня ў ёй, але турэмныя перажываньні так падзеілі на ягонае слабое здароўе, што неўзабаве памёр.

* * *

Як апавядаюць мае малодшыя сябры з камэры, экзэкуцыі ў вялейскай турме ў 1944 годзе былі вельмі частыя. 4-га ліпеня 1944 г. каля ***400*** чалавекаў немцы вывезьлі на могілкі й расстралялі ўсіх, самы ўцякаючы перад бальшавіцкім наступам.

Згодна з маімі больш-менш дакладнымі дадзенымі, на працягу трох год нямецкае акупацыі праз вялейскую турму прайшло каля ***3000*** чалавекаў. Лічаным адзінкам удалося зь яе выйсьці на волю.

Даўгія равы-магілы пры спаленай старой вялейскай турме крыюць у сабе косьці больш як ***2000*** беларусаў, што актыўна змагаліся зь гітлерызмам і сваё жыцьцё злажылі на аўтар Волі. Спаміж іх велізарная, пераважная колькасьць — гэта беларуская сялянская маса й беларуская сёлавая інтэлігенцыя.

*Мартыралёгія Беларускага Народу* чакае на свае дасьледваньні, асабліва-ж чакае на іх баёвая, аж да адчаю адважная — вялейская акруга, якая ў змаганьні з акупантам можа найбольш панесла ахвяраў, спрычыняючы й ворагу цяжкія страты.

***Алесь Маханеўскі***

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ТРАВЕНЬ (працяг)*

*21 траўня* ў судзе Партызанскага раёну разглядалася справа ўдзельніка акцыі-пэрфомансу „Дзень псіхічнага здароўя" ***Валерыя Жэрбіна***. За „ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу, паўторна на працягу года" ён быў пакараны адміністрацыйным арыштам на 10 сутак.

*22 траўня ў Барысаве* на футбольным стадыёне былі затрыманыя 7 чалавек — прадстаўнікоў маладзёвай арганізацыі „Зубр". (Падчас матчу мясцовай каманды „БАТЭ" і „Тарпеда" зь Менску. „БАТЭ" атрымала перамогу, і маладыя людзі віталі сваю каманду сьцягамі з выявай белага зубра на чорным полі, за што і былі затрыманыя міліцыяй, дастаўленыя ў аддзяленьне.) Зь іх узялі тлумачэньні і праз паўтары гадзіны адпусьцілі.

*22 траўня* ў судзе Першамайскага раёну Менска пачалося судовае паседжаньне па зыску студэнта 4 курсу юрыдычнага факультэту Пінскага філіялу Інстытуту кіраваньня і прадпрымальніцтва ***Вадзіма Макеева***. (26 верасьня 2000 г. ён прыйшоў у інстытут у беларускай кашулі-вышыванцы. У той жа дзень дырэктар Пінскага аддзяленьня інстытуту **Валеры Савінаў** выклікаў яго і прымушаў зьняць кашулю, а 30 верасьня вынес студэнту строгую вымову. 13 кастрычніка ў Інстытуце быў вывешаны загад аб адлічэньні Вадзіма з фармулёўкай „парушэньне ўнутранай дысцыпліны". Намесьнік дырэктара **Васіль Янчукоў** патлумачыў, што студэнт Макееў заклікаў студэнтаў выступаць у якасьці назіральнікаў на выбарах у „палату прадстаўнікоў". Пасьля ўмяшальніцтва прэсы і грамадзкіх арганізацыяў Савінаў адмяніў гэты загад.

„7 сакавіка 2001 г. а 19-й гадзіне, — распавёў Вадзім Макееў, — я і некалькі маіх сяброў былі затрыманыя міліцыяй за распаўсюджваньне налепак. 6 красавіка я і некалькі маладых хлопцаў былі выкліканыя ў Пінскае аддзяленьне Камітэту Дзяржаўнай Бясьпекі. Сьледчы неаднаразова пытаўся, да якой арганізацыі я належу, а таксама, што я буду рабіць, калі мяне выганяць з інстытуту." 9 красавіка быў падпісаны загад пра адлічэньне Вадзіма з інстытуту за „пропускі заняткаў па няўважлівай прычыне". „Фармулёўка загаду не адпавядала рэчаіснасьці, бо ў гэты пэрыяд я знаходзіўся на занятках, — сьцьвяржае Вадзім. — 22 траўня на судзе з майго боку выступілі трое сьведкаў — 2 студэнты і выкладчык. На судзе студэнты-сьведкі заявілі пра магчымасьці фальсіфікацыі з боку адміністрацыі. Была заяўленая экспэртыза тых подпісаў у журналах, якія зьяўляюцца сумніўнымі, г.зн. могуць быць падробленымі." Суд перанесены на 10 чэрвеня, бо суддзя запатрабаваў ад інстытуту прадставіць дадатковыя матэрыялы, а абарона заявіла хадайніцтва аб выкліку сьведкаў. На цяперашні момант Вадзім адлічаны з інстытуту і ня можа наведваць заняткі.

*22 траўня.* Праз месяц пасьля правядзеньня ў сталіцы хэпэнінгу „Канчатковы дыягназ" на 10 сутак адміністрацыйнага арышту асуджаны ўдзельнік акцыі ***Валеры Жэрбін***.

*Травень.* Эўрапэйскі парлямант прысудзіў ***Юрыю Бандажэўскаму*** (рэктару Гомельскага мэдычнага інстытуту), супраць якога вядзецца судовы працэс, *Пашпарт свабоды.* Ліст з паведамленьнем пра гэта, падпісаны дэпутатамі 15-ці краінаў Эўразьвязу, накіраваны Лукашэнку.

*Травень.* У Бераставіцкім раённым судзе разглядаецца адміністрацыйная справа па абвінавачваньні сьвятара *Беларускай Народнай Аўтакефальнай Царквы* ***Івана Спасюка і матухны Алены*** ў хуліганстве. Хуліганства заключалася ў тым, што сьвятар правёў службу ў капліцы на беларускай мове. Суддзя **Н. Казакевіч** заявіла абвінавачанаму, які патрабаваў весьці працэс на беларускай мове, што ён „абавязаны" ведаць расейскую мову.

*Травень.* Са школьнай праграмы „вычышчаюць" ***Францішка Багушэвіча***. У школах Беларусі пачаліся выпускныя экзамены. Аднак сёлета, ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў, выпускнікі ня будуць рыхтаваць да экзаменаў па беларускай літаратуры прадмову *Францішка Багушэвіча* да зборніка *„Дудка беларуская"* і аповесьць ***Максіма Гарэцкага „Ціхая плынь"***. Гэтыя творы проста выключаныя з экзаменацыйных білетаў.

*24 траўня* ў судзе Цэнтральнага раёну Менска адбылося судовае паседжаньне па адміністрацыйнай справе намесьніка старшыні *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Сяргея Папкова***. Перадгісторыя

судовага працэсу наступная. Напярэдадні акцыі 18 траўня (калі рыхтавалася мірная акцыя пратэсту супраць скліканага Лукашэнкам „усебеларускага сходу”) спадару *Папкову* патэлефанаваў падпалкоўнік міліцыі **Гірэль**. Сэнс сказанага ім зводзіўся да наступнага: калі спадар *Папкоў* (які зьяўляўся адным з заяўляльнікаў акцыі 18 траўня) адмовіцца ад сваіх намераў і не павядзе людзей на плошчу, дык усё будзе добра. А калі не — дык *С. Папкову* давядзецца адказваць за ўдзел у акцыі 26 красавіка, арганізаванай *Беларускім Народным Фронтам* да ўгодкаў Чарнобыльскай катастрофы.

Па словах С. Цурко (адваката сп. Папкова), у дадзеным выпадку меў месца „шантаж з боку супрацоўнікаў міліцыі. Упершыню з матэрыялаў адміністрацыйнай справы адкрыта вынікае, што міліцыя ажыцьцяўляе палітычны перасьлед, ужываючы пагрозы, прымушае грамадзянаў адмаўляцца ад свайго канстытуцыйнага права на мірныя сходы”.

На судзе сьведкі-міліцыянты пацьвердзілі, што складалі рапарты на сп.Папкова не 26 красавіка, а 15 траўня — такі ў іх быў загад. Гэты факт пацьвердзілі эксперт-крыміналіст Маскоўскага РУУС **Аляксей Анціпаў** і эксперт-крыміналіст **Генадзь Гормаш** (у апошняга ў рапарце наогул было напісана не „Папкоў”, а „Папоў”).

Суддзя **Натальля Вайцяховіч** вынесла спадару *Папкову* папярэджаньне.

*24 траўня ў Горадні* скончыўся суд над ***Вадзімам Саранчуковым*** (адным з арганізатараў мітынгу 25 Сакавіка. Мітынг быў дазволены ўладамі. Суддзя **Дзімітры Дземчанка** вырашыў, што апроч мітынгу адбылася недазволеная дэманстрацыя, і лідар *Маладога Фронту Горадні* вінаваты. Не клапоцячыся пра доказы, суддзя прысудзіў юнаку велізарны штраф — 150 мінімальных заробкаў.

*24 траўня ў Барысаве* Рада філіі СДП „Народная Грамада” праз адмысловую ўлётку паведаміла, што дырэкцыя грузавога аўтапарку №1 прыняла пастанову наконт звальненьня ***Алесі Ясюк*** — намесьніцы старшыні гарадзкой і абласной арганізацыі партыі. Улётка распаўсюджвалася ў людных месцах горада.



***Ворша. Група адраджэнцаў-фронтаўцаў перад пачаткам пікету.***

*Алеся Ясюк* палітычна актыўная асоба ў Барысаве. Яе звальненьне гэта ёсьць грубае парушэньне закону і правоў асобы, адкрыты палітычны перасьлед. „Даволі гэтых сьцягоў, пікетаў, ды ўсяго іншага”, — сказала дырэкцыя, звальняючы працаўніцу.

*25 траўня* спадар ***Сяргей Папкоў*** (намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*) зьявіўся па позве ў Савецкі РУУС Менску. Спачатку міліцыянты запісалі зь яго словаў „тлумачэньне” наконт выданьня і распаўсюджваньня бюлетэня *„Беларуская Салідарнасьць”. Сп. Папкоў* патлумачыў, што ў адпаведнасьці з Законам аб друку, ня трэба рэгістраваць друкаваныя выданьні, наклад якіх не перавышае 299 асобнікаў. Аднак гэтая позва ў РУУС была арганізаваная зусім не для тлумачэньняў. Міліцыянты склалі пратакол аб затрыманьні *сп. Папкова* „па абвінавачваньні ў распаўсюджваньні незарэгістраваных выданьняў”. Нягледзячы на ягоны пратэст і адмову падпісаць пратакол, міліцыянты адвезьлі *сп. Папкова* ў Савецкі раённы суд дзеля судовай расправы. Безумоўны палітычны характар гэтых рэпрэсіяў улады, ськіраваных на перашкоду дзейнасьці *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ,* запалохваньне дзеячоў партыі і парушэньне правоў на свабодную інфармацыю.

*25 траўня.* Нядаўна пінчукі былі вымушаныя зьбіраць грошы на суботнік. Цяпер супрацоўнікаў установаў прымушаюць купляць латэрэйныя білеты „Берасьце” (выпусьціў Берасьцейскі аблвыканкам). Іх дабраахвотна раскуплялі неахвотна, таму ўлады распачалі прадаваць білеты прымусова.

*Травень.* На Піншчыне працягваецца прымусовы збор сродкаў на помнік савецкім партызанам Палесься, які мусіць быць усталяваны 28 чэрвеня. Аднак праз недахоп сродкаў, будаўніцтва пастамэнту і адліў бронзавага помніку замарудзілася. Каб іх прысьпешыць, улады пачалі ўсяляк выбіваць грошы з прадпрыемстваў, прадпрымальнікаў ды прыватных асобаў. На Піншчыне ў суседніх раёнах грошы прымусова зьбіралі нават у школьнікаў і навучэнцаў сярэдніх спэцыяльных навучальных установаў.

А напярэдадні жыхары вёсак, якія здаюць малако дзяржаве, атрымалі грошы за малако, зь якіх ужо вылічылі па 100 рублёў на помнік. Сялянаў нават не папярэдзілі і не патлумачылі, на што будуць адлічаныя іхныя грошы. *(А. Дзікавіцкі)*

*30 траўня.* Зьміцер Шыманскі зьвярнуўся ва Ўпраўленьне юстыцыі з просьбай аб рэгістрацыі дасьледчага аналітычнага грамадзкага аб’яднаньня (клюбу) *Дзедзіч.* У адказ Упраўленьне юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму падало на сп. Шыманскага ў суд Ленінскага раёну Берасьця з абвінавачваньнем, што ён кіруе незарэгістраванай арганізацыяй. Суд аштрафаваў ***Зьміцера Шыманскага*** на 50 мінімальных заробкаў (або 250 даляраў).

Клюб існуе ўжо 2 гады. Але ва Ўпраўленьні юстыцыі не жадаюць яго рэгістраваць. Ім не падабаецца назва арганізацыі (раней „дзедзічамі” называлі нашчадкаў спадчынных дзедавых маёнткаў). У Аблвыканкаме запатрабавалі, каб у расейскамоўнай вэрсіі назвы клюбу слова „дзедзіч” увогуле не выкарыстоўвалася (у расейскай мове няма такога паняцьця і адпаведніка).

Напалохала „вертыкаль” і тое, што ініцыятыўная група па стварэньні клюбу ўжо абвесьціла пра шэраг конкурсаў пад агульнай назвай *„Беларусь мая непаўторная!”* Мэта конкурсу — папулярызацыя беларускай ідэі сярод моладзі, садзейнічае захаваньню беларускай культуры і мовы.

Наконт рэгістрацыі клюбу адказу няма. Але зьявіўся зыск у суд, і нават штраф. *(А.Супрунюк)*

*30 траўня.* У Ленінскім судзе Менску сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Генадзь Пляшко*** аштрафаваны на 20 мінімальных заробкаў за тое, што 18 траўня на праспэкце Скарыны ён трымаў плякат *„Абаронім Беларусь!”.* Суддзя **Валеры Жданюк** палічыў гэта парушэньнем грамадзкага парадку.

*30 траўня* студэнта ***Філіпа Рачыцкага***, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* спрабаваў вербаваць кагэбіст. Студэнта запрасілі да прарэктара Акадэміі фізічнага выхаваньня **Я.Іванчанкі**, і той паведаміў, што адбудзецца сустрэча з супрацоўнікам КГБ. На наступны дзень чалавек у цывільным, які пардставіўся капітанам КГБ **Андрэем Карпавічам**, цікавіўся палітычнымі поглядамі студэнта, і

асабліва ягоным удзелам ў акцыі 18 траўня (за ўдзел у акцыі Ф.Рачыцкі быў аштрафаваны судом на 30 мінімальных заробкаў). Кагэбіст настойваў, каб іхная сустрэча засталася ў таямніцы. На што студэнт адказаў, што ўжо паведаміў шэрагу асобаў аб мяркуемай сустрэчы і адмовіўся падпісваць дакументы аб захаваньні таямніцы.

*31 траўня.* Вечарам у розных раёнах Менску былі затрыманыя 19 чалавек за распаўсюджваньне спэцвыпуску „Нашай Свабоды”, прысьвечанага эканамічнаму і палітычнаму становішчу ў Беларусі. Большасьць зь іх — студэнты Менскіх унівэрсітэтаў.

Хлопцаў і дзяўчат затрымлівалі супрацоўнікі міліцыі „у цывільным”. Паводле загаду начальства, падчас „саміту” міліцыянты ў цывільным павінны патруляваць па менскіх вуліцах пад выглядам прахожых, затрымліваць „непажаданых элемэнтаў” і адвозіць у пастарунак.



***Аршанскія адраджэнцы. (Група Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

## *ЧЭРВЕНЬ*

*1 чэрвеня, Берасьце.* 10-га сьнежня мінулага году маладафронтаўцу ***Сяргею Бахуну*** Ленінскі раённы суд Берасьця за распаўсюджваньне тэксту Ўсеагульнай дэкляраціі правоў чалавека прысудзіў штраф — 200 мінімальных заробкаў (каля 1000 даляраў, сярэдняя зарплата за 2 гады). Юнак ня меў чым плаціць і штраф не сплаціў. Маразм судовай сістэмы на гэтым ня скончыўся. Праз паўгода судовы выканаўца прышоў да бацькоў Сяргея, каб апісаць іхнюю маёмасьць за штраф сына. Бацькі сказалі, што за грошы сына ў хаце нічога ня куплена. Тады пачаўся перасьлед бацькоў беларускага хлопца. У жніўні звольнілі з працы ягоную маці. У чэрвені адміністрацыя аб’яднаньня „Брэстплодагародніпапром” паставіла пытаньне аб скасаваньні працоўнага кантракту з бацькам — ***Пятром Бахуном***.

*1 чэрвеня ў Горадні* міліцыянты затрымалі фотакарэспандэнта газэты *„Пагоня”* ***Алеся Салея*** за тое, што ён фатаграфаваў, як жаўнеры рукамі вырывалі траву каля будынку Аблвыканкаму (г.зн. наводзілі парадак перад прыездам важных візыцёраў). Яго завялі ў будынак Аблвыканкаму і пачалі тэлефанаваць у КГБ (!). Дзьве гадзіны рупныя дзяржыморды чакалі адтуль падмогі, але „гэбуха” так і не прыехала. Урэшце фатографа адпусьцілі.

*1 чэрвеня ў Горках (Магілёўская вобласьць)* былі затрыманыя пяцёра ўдзельнікаў акцыі „Падзяліся ўсьмешкай”, якая праводзілася Горацкай арганізацыяй „Маладога Фронту” і была прымеркаваная да Дня абароны дзяцей. У дзіцячым парку Горак сабралася каля 50-ці дзяцей. Гучала музыка гурта *NRM*, ладзіліся конкурсы дзіцячых малюнкаў на асфальце, гульні і віктарыны. Дзецям дарылі беларускія кніжкі, паветраныя шарыкі і раздавалі газэту *„Несьцерка”*, а іхным бацькам — *„Народную Волю”* (з матэрыяламі пра зьніклых людзей і ўлёткі з заклікам прыняць удзел у выбарах 9-га верасьня). Акцыя доўжылася гадзіну і была спыненая асабіста начальнікам горацкага РАУС, які затрымаў пяцёх удзельнікаў акцыі, адмовіўшыся назваць прычыну затрыманьня.

*1 чэрвеня* суд Цэнтральнага раёну Менска вынес завочнае рашэньне ў адносінах да маладзёна ***Ц. Дранчука*** — арышт 15 сутак (за ўдзел у акцыі 25 Сакавіка — арт.167.1 КаАП). Згодна заканадаўства, справы па названым артыкуле разглядаюцца толькі ў прысутнасьці праваіпарушальніка. Па факце парушэньня заканадаўства накіраваныя скарга на імя старшыні Менскага гарадзкога суда і заява пракурору Цэнтральнага раёну Менска.

*3 чэрвеня.* Прадстаўнікі гарадзенскіх маладзёвых арганізацыяў вывесілі ў горадзе каля 700 чорных стужак у ноч з 3 на 4-га чэрвеня. Яны прымеркавалі гэтую акцыю да 18-й сэсіі „парляманцкага сходу” „саюзу” РФ і Беларусі, які праходзіў у гэтыя дні ў Горадні.

*4 чэрвеня ў Слоніме* ***Алесь Ясюк*** пакараны судом за распаўсюджваньне апазыцыйных улётак штрафам у 5 мінімальных заробкаў.

*4 чэрвеня* каля чыгуначнага вакзалу *ў Горадні* а 14-й гадзіне актывісты АГП, Маладой грамады і Маладога Фронту правялі акцыю „Хочам ведаць праўду”. Праз 15 хвілінаў да ўдзельнікаў пікету падышоў начальнік Ленінскага РУУС палкоўнік Васілеўскі ў цывільным і пачаў патрабаваць спыненьня несанкцыянаванай акцыі. Быў затрыманы ***Тадэвуш Гавін*** — былы старшыня Саюзу палякаў Беларусі, які запытаўся ў міліцыянтаў, чаму яны дагэтуль не знайшлі свайго міністра — ***Юры Захаранку***.

*4 чэрвеня.* За правядзеньне акцыі 18 траўня ў абарону Канстытуцыі і незалежнасьці Беларусі суд Цэнтральнага раёну Менска прысудзіў пяці сябрам *Народнага Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі* — БНФ штрафы у памеры 20-ці і 30-ці мінімальных заробкаў, двум зроблена папярэджаньне.

*4 чэрвеня.* На прэс-канфэрэнцыі *ў Менску* адзін з кіраўнікоў структураў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* сталіцы, студэнт III курса Беларускай Акадэміі фізічнага выхаваньня ***Піліп Рачыцкі*** расказаў аб спробе яго вярбоўкі. Піліп лічыць, што калі б ён не расказаў пра тое, што здарылася, то другая сустрэча прайшла б у іншым ключы, больш жорстка і, магчыма, яму прапанавалі б супрацоўнічаць з КГБ, пагражаючы адлічэньнем з Акадэміі.

Намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Сяргей Папкоў,*** які браў удзел у прэс-канфэрэнцыі, зазначыў, што гэта адпрацаваныя мэтады КГБ. Яны сьведчаць, што супрацоўнікі КГБ заўважаюць палітычна актыўных маладых людзей і пачынаюць зь імі „працаваць”, схіляючы да супрацоўніцтва. „Мы ацэньваем гэтую падзею вельмі сур’ёзна. Атрымліваецца, што КГБ, якое заклікане змагацца са злачыннасьцю, дзейнічае супраць грамадзянаў сваёй краіны. Калі гэтае ведамства вярбуе агентуру для супрацьдзеяньня законнай гарамадзка-палітычнай дзейнасьці, для разбурэньня арганізацыяў і партыяў, гэта супярэчыць Канстытуцыі і законам Беларусі”, — сказаў сп. Папкоў. *(Г.Барбарыч)*

*5 чэрвеня* — Міжнародны дзень аховы навакольнага асяроддзя. Гомельскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы гэтага асяроддзя на выязной калегіі ў райцэнтры Акцябарскі абмеркаваў санітарны стан

зямельных участкаў. Радыяцыйнае забруджаньне тэрыторыяў засталося па-за ўвагай. Пра яго нават ня ўспомнілі. Між тым, ***на Гомельшчыне ляжыць 66% усіх радыёактыўных выкідаў***, што прыйшліся на Беларусь пасьля выбуху на атамнай станцыі. ***У зоне забруджаньня і зараз жыве тры чвэрці насельніцтва рэгіёну — ледзь не паўтара мільёна жыхароў.*** На радыёактыўных землях людзі паранейшаму сеюць жыта, бульбу, гародніну, спажываюць няякаснае малако і мяса. Прычым, ня толькі там, дзе ўзровень забруджаньня мінімальны — 1–5 кюры. 74 калгасы і саўгасы рэгіёну аруць, сеюць і жнуць на землях, дзе забруджаньне перавышае 15 кюры на квадратны кілёмэтар.

Вынік такога гаспадараньня бачны напрыканцы кожнага году. Напрыклад, летась у Хвоніцкім раёне 90% збожжа аказалася непрыдатным для спажываньня. Утрыманьне стронцыя перавышала нават лагодныя беларускія нормы.

Усяго ж, па зьвестках Аблсельгасхарчу, звыш 18 тысячаў тон збожжа забракавалі на хлебапрыёмных пунктах з-за высокага ўтрыманьня радыёнуклідаў. Пра забруджанае збожжа на фураж ніхто й гаворкі не вядзе. Зрэшты, як і пра сена. Тэхналёгія скарыстаньня адпрацаваная. Лукашэнка на нарадзе ў абласным цэнтры заявіў, што ня трэба выдаткоўваць сродкі на будаўніцтва жыльля ў чыстых зонах. Калі хто хоча перасяляцца, няхай перасяляецца на цэнтральныя сядзібы забруджаных гаспадарак, дзе людзей даўно бракуе.

4000 сем'яў, якія маюць у рэгіёне права на адсяленьне з радыяцыйна небясьпечнага рэгіёну, наўрад ці змогуць рэалізаваць гэтае сваё права. *(К. Яноўскі)*

*5 чэрвеня ў Горадні* адбыўся суд над былым старшынёй Саюзу палякаў Беларусі ***Тадэвушам Гавіным***, затрыманым падчас акцыі „Хочам ведаць праўду". Суд вынес рашэньне: 3 сутак адміністрацыйнага арышту. Т.Гавін быў узяты пад варту ў зале суда.

*7 чэрвеня* ў Гомельскім дзяржаўным унівэрсітэце за распаўсюджаньне „Студэнцкай газэты" (афіцыйна зарэгістраванае выданьне) затрыманыя міліцыяй сябры Задзіночаньня беларускіх студэнтаў (ЗБС) ***Хрысьціна Сідун***, ***Сяржук Паўлюковіч***, ***Зьміцер Гаўрусік***, ***Андрэй Вітушка*** *(зьбіты да крыві)*.

Студэнты раздавалі газэты ў розных месцах Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсітэту імя Ф. Скарыны. Да *Андрэя Вітушкі* падышоў невядомы чалавек і прапанаваў прайсьці зь ім. На пытаньне хлопца „Хто вы такі, пакажыце пасьведчаньне", невядомы нечакана моцна штурхнуў Андрэя, у выніку чаго той разьбіў сваім целам шкло ў дзьвярах, пры гэтым моцна парэзаўся. Да іх падбегла *Хрысьціна Сідун,* убачыўшы, як невядомы заламаў руку Андрэю і біў яго галавой аб падлогу. (Як высьветлілася потым, „невядомым" быў старэйшы юрысткансульт Гомельскага ўнівэрсітэту **М**.**М**.**Мяжэвіч**. Тры гады таму ён кіраваў якраз гэтым аддзяленьнем міліцыі, быў падпалкоўнікам і пазбавіўся пасады за зьверскае зьбіцьцё анархістаў, адзін зь якіх памёр. У нападзе ўдзельнічаў і прарэктар па гаспадарчай працы **Н**.**Навуменка**)

Затрыманых актывістаў ЗБС даставілі ў Цэнтральнае ўпраўленьне міліцыі Гомеля. У зьбітага *Андрэя Вітушкі* не спыняўся крывацёк, але супрацоўнікі міліцыі катэгарычна адмаўляліся выклікаць „хуткую дапамогу", затое выклікалі супрацоўнікаў КГБ.Міліцэйскія пратаколы пачалі пісаць толькі напрыканцы дня, прычым пад дыктоўку тых самых асобаў, якія напалі на студэнтаў.

Толькі пад вечар Андрэю выклікалі „хуткую дапамогу". Лекары канстатавалі вывіх рукі і наклалі швы. На наступны дзень судова-медычная экспэртыза зафіксавала ў пацярпелага А.Вітушкі сінякі і рэзаныя раны на ілбе, крывападцёкі каля вачэй, на шыі, падскурныя разрывы сасудаў, сінякі на грудзях, рэзаныя раны на далонях, гузы на нагах. Пацярпелы падаў заяву ў пракуратуру.

*7 чэрвеня* . Прадаўжаецца зьнішчэньне помнікаў Беларусі. У Магілёве невядомыя скралі Чарнобыльскі крыж, які ўсталяваў *Беларускі Народны Фронт* на 12-ю гадавіну Чарнобыльскае трагедыі. Разам з крыжам зьнікла і шыльда, усталяваная 26 красавіка 1998 году ў памяць ахвяраў Чарнобылю. Менавіта тады пад пільным наглядам міліцыянтаў мясцовыя фронтаўцы прайшлі з крыжам па вуліцах гораду і ўсталявалі яго каля дарогі да прамысловага аб'яднаньня „Хімвалакно".

Тры гады запар на кожныя ўгодкі Чарнобыля людзі праводзілі тут імправізаваныя мітынгі-рэквіемы, пакуль нехта ня вырваў крыж зь зямлі.

Прадстаўнікі раённай „вертыкалі" адмаўляюць сваё дачыненьне да зьнікненьня крыжа і характарызуюць здарэньне як звычайнае рабаўніцтва.

Апошнім часам гэта не адзіны выпадак рабаўніцтва помнікаў гісторыі і культуры ў Магілёве. Напярэдадні са скульптуры ***Эўфрасіньні Полацкай*** невядомыя скралі фрагмэнты помніка і выяву крыжа. Цьверджаньне пра крымінальны характар злачынстваў выклікае сумнеў. І Чарнобыльскі крыж, і складнікі помніка *Эўфрасіньні Полацкай* зробленыя з дрэва, і вялікай матэрыяльнай каштоўнасьці яны ня маюць.*(А. Сердзюкоў)*

*8 чэрвеня* стала вядома, што старшыня *Ляхавіцкай раённай Рады Беларускага Народнага Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Ігар Лобан***, прачытаўшы артыкул ***Ул. Старчанкі „***Ідзе вялікая Чарнобыльская вайна!" (які зьявіўся ў друку), дзе утрымліваліся зьвесткі аб наступствах Чарнобыльскай трагедыі на Беларусі, палічыў, што гэтую інфармацыю павінна ведаць „вертыкаль". Ён перадрукаваў артыкул і занёс старшыні Ляхавіцкага райвыканкаму **А**. **Сакуну** і старшыні Ляхавіцкага райсавету **В**. **Сапуну**. Замест падзякі, галоўны вертыкальшчык раёну зрабіў выснову, што спадар Лобан распаўсюдзіў друкаванае выданьне, зьмест якога накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку. 7 траўня сп. Лобана выклікалі ў РАУС, дзе на яго склалі пратакол аб адміністрацыйным парушэньні па арт. 172 ч.3 КаАП. 12 траўня Адміністрацыйная камісія пры Ляхавіцкім райвыканкаме разгледзела гэты пратакол, прызнала сп.Лобана вінаватым і аштрафавала яго на 5700 рублёў.

*Сп. Лобан* з пастановаю Камісіі ня згодны і падаў у суд на пастанову Камісіі.

*8 чэрвеня, Менск. Малады Фронт* распачаў акцыю *„Ні дня безь сьцяга"*. Акцыя будзе працягвацца да дня выбараў прэзыдэнта. Актывісты *Маладога Фронту* будуць вывешваць *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* на галоўных будынках Менску і ў рэгіёнах Беларусі. Першы сьцяг зьявіўся насупраць чыгуначнага вакзалу, на гадзіньнікавай вежы — так званай „браме" беларускай сталіцы.

■ Тым часам праваахоўчыя ворганы працягваюць перасьлед маладафронтаўцаў. За ўдзел у акцыі „Апошні паход на Бангалёр" ***Дзяніс Мархаток***, паводле рашэньня камісіі па справах непаўнагадовых, павінен заплаціць штраф (1 мінімальны заробак). Акрамя таго, адміністрацыя 86-й школы Менска папярэдзіла дзесяцікласьніка, што яму пагражае выключэньне са школы. Дзянісу Мархатку патлумачылі, што ў яго ня тая прапіска. „Пасьля таго, як адміністрацыя школы даведалася, што я ў *Маладым Фронце* і прымаю актыўны ўдзел у акцыях, мне праз кляснага кіраўніка паведамілі, што, паколькі прапіска ў мяне ня менская, мне трэба рыхтавацца да выключэньня са школы. Мне намякнулі, што ў іх ёсьць свае дзеці, зь якімі яны таксама не спраўляюцца, а такіх праблемаў, як са мной, ім ня трэба", паведаміў Дзяніс Мархаток.

*11 чэрвеня* зьнік ***Максім Саханчук***, студэнт 3-га курсу Пінскага інстытуту кіраваньня, які зьяўляецца старшынёй суполкі ЗБС. Апошні раз Максіма бачыла старшыня ЗБС *Хрысьціна Сідун*. Яна разьвіталася зь ім 11 чэрвеня на станцыі мэтро *Якуба Коласа ў Менску* а 18-й гадзіне. Пры сабе Максім меў стос „Студэнцкай газэты", якую ён вёз у Пінск, каб распаўсюдзіць сярод студэнтаў. Са слоў бацькоў, дамоў Максім не зьявіўся. Бацькі абтэлефанавалі ўсіх сваякоў, сяброў і знаёмых сына, але ніхто з 11-га чэрвеня яго ня бачыў і ня ведае, дзе ён знаходзіцца. Бацькі падалі заяву на вышук у ворганы міліцыі. (Нагадаем: месяц таму на суполку ЗБС у Пінску ціснулі спэцслужбы. Сяброў ЗБС, у тым ліку і Максіма Саханчука, выклікалі ў КГБ і бралі распіскі, што яны ня будуць займацца грамадзкай дзейнасьцю; зь імі праводзілі „выхаваўчыя" гутаркі.)

*17 чэрвеня* каля пад'езду ўласнага дому невядомымі нападнікамі быў зьбіты прафэсар ***Аляксандар Давойна***, намесьнік дырэктара Беларускага

радыяцыйнага інстытуту, які займаўся радыяцыйным кантролем харчаваньня ў Чарнобыльскай зоне. Ня выключана, што напад зьвязаны са справай ***Юры Бандажэўскага***.

*18 чэрвеня.* Сябры ініцыятыўнай групы грамадзянаў па вылучэньні кандыдатам у прэзыдэнты *Зянона Пазьняка* дамагаюцца таго, каб Цэнтрвыбаркам выдаў ім пасьведчаньні і падпісныя лісты на беларускай мове. „Адмаўленьне выдаць дакументы на беларускай мове не стасуецца са зьместам і духам закону, груба абмяжоўвае нашыя нацыянальныя правы", — заявіў старшыня ініцыятыўнай групы ***Сяргей Папкоў***.

*19 чэрвеня* быў вынесены прысуд па справе былога рэктара Гомельскага медінстытуту прафэсара ***Ю. Бандажэўскага*** і былога прарэктара ***У. Раўкова***.

Выязная вайсковая калегія Вярхоўнага суда Беларусі прызнала *Ю. Бандажэўскага* і *У. Раўкова* вінаватымі ў інкрымінаваных ім злачынствах і, згодна арт.430 ч.2 КК Беларусі (атрыманьне хабару), вынесла ім прысуд: 8 гадоў пазбаўленьня волі ў калёніі строгага рэжыму. У якасьці дадатковага пакараньня У. Раўкоў і Ю. Бандажэўскі асуджаныя да канфіскацыі маёмасьці , а У. Раўкоў пазбаўлены вайсковага званьня „падпалкоўнік". Астатнім асобам, якія праходзілі па гэтай справе, вынесеныя ўмоўныя тэрміны з адтэрміноўкай прысуду. Родныя і адвакаты асуджаных зьбіраюцца абскарджваць прысуд.

*18 чэрвеня, Баранавічы.* Ніводны з прадстаўнікоў баранавіцкіх дэмакратычных суполак не патрапіў у склад гарадзкой камісіі па выбарах прэзыдэнта — такі вынік сумеснага паседжаньня мясцовых выканкамаў і прэзыдыюму гарсавету. Загадчык арганізацыйнага аддзелу гарвыканкаму **Леанід Лойка** адразу заявіў, што з дваццаці сямі заяваў дзевяць нават ня будуць разглядаць. Гэтую „чорную" дзявятку склалі якраз заявы ад дэмакратычных арганізацыяў.

Такім чынам, Баранавіцкая гарадзкая камісія па выбарах прэзыдэнта сфармаваная, у большасьці, з тых асобаў, хто быў у складзе акруговых камісіяў падчас выбараў у „палату прадстаўнікоў", г. зн. са стаўленьнікаў лукашэнкаўскай „вертыкалі".

***( Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і Прэс-служба БНФ.*** *Па матэрыялах Камісіі, СМІ (друку, радыё), „Вясны-96", SANA)*

# ЧАРНОБЫЛЬСКІ ЭСКАДРОН ?

У чэрвені ў Менску ў пад'езьдзе свайго дому зьбіты вядомы навуковец, прафэсар, намесьнік дырэктара інстытуту радыяцыйнай медыцыны (БелРад) ***Аляксандар Дэвойна***. Ён знаходзіцца ў рэанімацыйным аддзяленьні шпіталю. Стан ацэньваецца як цяжкі. У прафэсара Дэвойны пераламаныя косьці носа і страсеньне мазгоў.

Распачатая крымінальная справа. Зламысьнік, які напаў на прафэсара, быў узброены кастэтам.

Дырэктар інстытуту БелРад *Васіль Несьцярэнка* мяркуе, што гэтае злачынства можа мець і не крымінальныя прычыны. Прафэсар *Дэвойна* актыўна займаўся кантролем за радыяцыйнай забруджанасьцю прадуктаў харчаваньня ў Беларусі. „Я не выключаю, што ягоная дзейнасьць ёсьць галоўнай прычынай інцэдэнту", — сказаў *В. Несьцярэнка.*

Пасьля расправы над прафэсарам ***Бандажэўскім*** паводзіны спраўцаў чарнобыльскага генацыду на Беларусі становяцца ўсё больш крымінальнымі.

***(З радыё „Свабода")***

# КУЛЯ Ў ГАЛАВЕ *(Думкі намэклятуры)*

### *„Туды, у Маскву, у Маскву..."* *(А. Чэхаў)*

„Свои деньги я размещал только в московских банках."*

*(Міхаіл Чыгір, Народная Воля, — 2001, 10 ліпеня)*

### *Што ён гаворыць?*

„Я поставил перед собой задачу: за 10 лет перейти на самоокупаемость в содержании органов власти. Этого и добивался. Объёмы были большими, в последнее время около 100 организаций, около 20000 работающих."**

*(Іван Ціцянкоў, Народная Воля, — 2001, 10 ліпеня)*

### *Галоўны Дзяржаўны праўнік пра Лукашэнку:*

„Ну, я ня ведаю, якое ён мае на сёньняшні дзень сямейнае становішча."

*(В.Галаванаў, начальнік Галоўнае дзяржаўна-праўнае ўправы адміністрацыі прэзыдэнта. Радыё „Свобода", 31 ліпеня 2001 г.)*

### *Будзь, каб ты...*

„В Беларуси не будет Каштуницы, будет Гончарик." ***

*(Ганчарык)*

### *Процька „о власти"*

„Мы хотим настоящего диалога с властью. Если мы сумеем этот диалог организовать, в сознании людей произойдет огромный скачок."

### *Процька пра выбары*

„Совершенно неважно, как бы люди проголосовали: выбрали бы Гончарика или кого-то другого."

### *Процька пра выбары і „власть"*

Данные выборы сорваны определенными конкретными людьми. Я думаю, что президент уже начал разбираться с ними и отставка Владимира Заметалина, который был его главным идеологом, — яркое тому свидетельство...

Мы считаем, что виновные должны быть наказаны, и то, что президент одного конкретного виновного уже нашел — правильно.

Мы считаем, что есть конкретные виновные. Прежде всего, это председатель Центризберкома Лидия Ермошина...

Я считаю, что вина за непризнание президента по результатам наблюдения БДИЧ лежит и на этом должностном лице."****

*(Тацьцяна Процька, інтэрв'ю. Белорускій Рынок, — 2001, №37)*

### *І ты, брат...*

„Когда наша команда придёт к власти, то очень скоро зарплата в 200-250 долларов в месяц станет реальностью..."******

*(Міхаіл Марыніч, Народная Воля, 14 ліпеня 2001 г.)*

***(Матэрыял сабраў Адам МІКША)***

---

* Свае грошы я зьмяшчаў толькі ў маскоўскіх банках (з рус.)

** Я паставіў перад сабой задачу: за 10 гадоў перайсьці на самаакупаемасьць ва ўтрыманьні органаў улады. Гэтага і дамагаўся. Аб'ёмы былі вялікімі, у апошні час 100 арганізацыяў, каля 20000 працуючых. (з рус.)

*** У Беларусі ня будзе Каштуніцы, будзе Ганчарык. (з рус.)

**** Мы хочам сапраўднага дыялёгу з уладай. Калі мы здолеем гэтакі дыялёг арганізаваць, то ў сьведамасьці людзей адбудзецца велізарны скачок.

Зусім ня мае значэньня, як бы людзі прагаласавалі: выбралі б Ганчарыка ці кагосьці іншага.

Дадзеныя выбары сарваныя адпаведнымі канкрэтнымі людзьмі. Я думаю, што прэзыдэнт ужо пачаў разьбірацца зь імі і адстаўка Ўладзімера Замэталіна, які быў яго галоўным ідэолягам, — выразнае гэтаму сьведчаньне.

Мы лічам, што вінаватыя павінны быць пакараныя, і тое, што прэзыдэнт аднаго канкрэтнага вінаватага ўжо знайшоў, — правільна.

Мы лічым, што ёсьць канкрэтныя вінаватыя. Перш за ўсё, гэта старшыня Цэнтарвыбаркаму Ліда Ярмошына...

Я лічу, што віна за непрызнаньне прэзыдэнта па выніках назіраньняў БДІЧ ляжыць і на гэтай службовай асобе. (з рус.)

***** Калі наша каманда прыйдзе да ўлады, то вельмі хутка заробак у 200-250 даляраў у месяц стане рэальнасьцю. (з рус.)

# АСЬЦЯРОЖНА З ДУРНЯМІ!

У Магілёве трэба вельмі асьцярожна абыходзіцца з дурнямі.

Неяк перад выбарамі журналіст Магілёўскага тэле-радыёаб'яднаньня прышоў на працу ў маячцы, на якой было напісана: *„Скажам дурню: НЕ!"*

Кіраўнік Тэле-радыёаб'яднаньня (былы намесьнік старшыні Гарвыканкаму **Яўген Мельнікаў**), ня доўга думаючы, выдаў загад, у якім адзначыў, што пазбаўляе заробку свайго падначаленага, бо лічыць, што ён абразіў гонар і годнасьць Лукашэнкі.

Кіраваць, дык кіраваць, відаць, вырашыў спадар Мельнікаў і забараніў за адно рэдактару абласнога радыё ***Уладзімеру Лабцэвічу*** называць радыёслухачоў „шаноўным спадарствам"*.

***Г. ПАШКОЎСКАЯ***

---

* Гэткім чынам забараняючы беларускія звычаёвыя тэрміны, расейскія шавіністы заўсёды змагаліся зь беларускай культурай і зьнішчалі беларушчыну. (рэд.)

# ДАКУМАНТЫ

У пачатку траўня 1996 г. (як паведамлялася ў друку) А.Лукашэнка сабраў кіраўнікоў „сілавых" ведамстваў і КГБ і зрабіў „разнос" за тое, што „упустили Пазьняка". У гэты ж час па яго распараджэньні Дзяржкамітэт памежных войскаў выдаў загад, дзе напісана: *„З. Пазьняка, С. Навумчыка пры ўезьдзе-выезьдзе затрымаць"*. Вытрымкі з загаду былі надрукаваныя ў гэты час у газэце „Свабода" і іншых выданьнях, а прозьвішчы *Пазьняка* і *Навумчыка* зьявіліся ў сьпісах памежнага кантролю.

Усё гэта, ня гледзячы на розныя вусныя заявы чыноўнікаў і супярэчлівыя адказы зь ведамства памежных войскаў, застаецца бяз зьменаў па сёньняшні дзень, што дакладна праверана неафіцыйным спосабам.

* * *

Дзіўны выпадак здарыўся ў ліпені бягучага года з *Сяргеем Навумчыкам.* Расейская амбасада ў Чэхіі, пасьля доўгай цяганіны і недагаворак, адмовіла яму ў службовай візе. (Журналіста С. Навумчыка камандзіравала радыё „Свабода" ў Маскву з рэдакцыйным заданьнем.) Неафіцыйна выявілася, што Масква па дамоўленасьцях з Лукашэнкам павінна б была С. Навумчыка затрымаць і перадаць у Менск. А гэта ў дадзенай сітуацыі — міжнародны скандал, дзе Масква выглядала б вельмі непрыгожа, бо, у дадзеным выпадку, спадар Навумчык зьяўляецца афіцыйнай асобай ад радыё „Свабода" і галоўнае — першым беларускім палітычным эмігрантам (разам з З. Пазьняком), азыль якім далі Злучаныя Штаты Амэрыкі (пры непасрэдным удзеле ў вырашэньні гэтага пытаньня Прэзыдэнта ЗША). Таму з усяго дрэннага выбралі найменшую дрэннасьць: без тлумачэньняў адмовілі С. Навумчыку ў службовай візе.

Паведамленьне пра выпадак з С. Навумчыкам друкавалі газэты *Беларускі час (20.07.2001г.)* і *Пагоня (26.07.2001 г.).*

Ніжэй друкуем перапіску, якая адбылася паміж *Партыяй БНФ* і афіцыйнымі ведамствамі. Асабліва цікавыя дакуманты з Дзяржкамітэту памежных войскаў, дзе на запыт *Ю. Беленькага* дадзены два адказы, якія супярэчаць адзін аднаму.

* * *

*35/2001, 30 мая 2001 г. У Пракуратуру Рэспублікі Беларусь г. Менска, вул. Інтэрнацыянальная, 22.* **Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ Зянон Станіслававіч Пазьняк — вядомая на Беларусі асоба.**

**Палітычная, грамадзкая, навуковая дзейнасьць Зянона Пазьняка заслужыла павагу мільёнаў грамадзянаў нашай краіны. Відавочна, што прыхільнікі Зянона Пазьняка будуць вылучаць яго кандыдатам на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь падчас маючай адбыцца ў гэтым годзе ў краіне прэзыдэнцкай кампаніі.**

**Просім афіцыйна паведаміць, што грамадзянін Рэспублікі Беларусь Зянон Станіслававіч Пазьняк, які нарадзіўся 24 красавіка 1944 г., не падлягае крымінальнай адказнасьці і супроць яго няма дзейсных крымінальных справаў.**

***Выконваючы абавязкі старшыні Ю. Беленькі***

* * *

*12.06.2001 № 18-19сл.-97 И.о. председателя Консервативно-Христианской Партии — БНФ Беленькому Ю.А.* **В связи с Вашим обращением в Пракуратуру республики сообщаю, что 19.06.1997 по фактам публикаций З. Позняком серии статей в газетах „Пагоня" и „Свабода", содержащих высказывания, направленные на разжигание национальной вражды, унижающие национальную честь и достоинство русского народа, возбуждено уголовное дело по ст. 71 УК Республики Беларусь.**

**В настоящее время производство по делу приостановлено, так как З. Позняк выехал за пределы Республики Беларусь, а принять окончательное решение по делу возможно только после его допроса.**

***И.о. начальника управления по надзору за следствием в органах прокуратуры И.К. Зуй***

* * *

*Пракуратура Рэспублікі Беларусь; В.а. Начальніка ўпраўленьня па нагляду за сьледствам у ворганах пракуратуры Зую І.К. На Ваш № 18-19сл.-97 за 12.06.2001 г.*

**Згодна Вашага ліста, упершыню афіцыйна стала вядома пра тое, што супроць Старшыні Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ З. С. Пазьняка 19.06.1997 г. ўзбуджана крымінальная справа па артыкулу 71 КК Рэспублікі Беларусь „па факту публікацыі ім сэрыі артыкулаў у газэтах „Пагоня" і „Свабода", утрымліваючых выказваньні, накіраваныя на распальваньне нацыянальнай варожасьці, прыніжэньне нацыянальнага гонару і годнасьці рускага народа". За мінулы тэрмін, з указанай Вамі даты і па сёньняшні дзень, у адрас Партыі БНФ, дзе З.С. Пазьняк працуе на сталай працы на пасадзе Старшыні партыі, зваротаў і запытаў з боку праваахоўных органаў і пракуратуры па факту публікацыі у сродках масавай інфармацыі не было. За пэрыяд з 19.06.1997 г. па чэрвень 2001 г. паведамленьняў пра тое, што Старшыні партыі З.С. Пазьняку неабходна зьявіцца ў пракуратуру ці нейкія іншыя органы для высьвятленьня акалічнасьцяў, зьвязаных з публікацыямі артыкулаў альбо па іншых справах, не паступала.**

**У сувязі з вышэйадзначаным, прашу паведаміць, у якіх нумарах газэтаў „Пагоня" і „Свабода" апублікаваныя артыкулы З. Пазьняка, якія сталі падставай для ўзбуджэньня крымінальнай справы па арт. 71 КК Рэспублікі Беларусь.**

**Адказ прашу накіраваць па адрасу: 220114, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 133-147 альбо па факсу 285-34-70**

***Выконваючы абавязкі старшыні Ю. Беленькі***

* * *

*21 чэрвеня 2001 г. У Пракуратуру Рэспублікі Беларусь*

**У сувязі з паведамленьнем в.а. начальніка Ўпраўленьня па нагляду за сьледствам у ворганах Пракуратуры сп. І.К.Зуя (ліст 12.06.2002, №18-19 сл-97) аб тым, што „19.06.1997 г. па фактах публікацыяў З. Пазьняком сэрыяў артыкулаў у газэтах „Пагоня" і „Свабода" ўзбуджана крымінальная справа па арт. 71 КК Рэспублікі Беларусь", прашу паведаміць, на якой *падставе* была ўзбуджана справа, па якой *пастанове* (кім прынятай і калі), па якіх канкрэтна *матэрыялах* (артыкулах) і па якім *зьмесьце* напісанага і надрукаванага.**

***Зянон ПАЗЬНЯК***

***Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ і Беларускага народнага Фронту „Адраджэньне"***

* * *

*07.07.2001 №18-19сл-97 Председателю Консервативно-Христианской Партии — БНФ и Белорусского Народного Фронта „Адраджэньне” Позняку З. С.*

**В дополнение к информации №18-19сл-97 от 12.06.2001 г. сообщаю, что уголовное дело по ч.1 ст.71 УК Республики Беларусь (в редакции 1960 года) возбуждено 19 июня 1997 года по фактам публикаций серии статей под названием „Беларускі шлях” и „Вызвольны рух” в газетах „Пагоня” в №№24 (171)—26 (173) за июнь-июль 1996 года и „Свабода” в №№ 64-65 за 17 и 18 июня 1997 года. Предварительное расследование проводилось следователем прокуратуры республики.**

**В настоящее время производство по делу приостановлено. Принять окончательное решение по нему без Вашей явки в прокуратуру и допроса не представляется возможным.**

*И.о. начальника управления по надзору за следствием в органах прокуратуры И.К.Зуй*

* * *

*№ 34ё2001 30 мая 2001г. Камандуючаму памежнымі войскамі генерал-лейтэнанту А. Паўлоўскаму*

**Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ Зянон Станіслававіч Пазьняк — вядомая на Беларусі асоба.**

**Палітычная, грамадзкая, навуковая дзейнасьць Зянона Пазьняка заслужыла павагу мільёнаў грамадзянаў нашай краіны. Відавочна, што прыхільнікі Зянона Пазьняка будуць вылучаць яго кандыдатам на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь падчас маючай адбыцца ў гэтым годзе ў краіне прэзыдэнцкай кампаніі.**

**У той жа час, ад грамадзянаў Беларусі пастулаюць паведамленьні пра тое, што імя Зянона Станіслававіча Пазьняка ўнесена ў сьпісы памежнага кантролю Рэспублікі Беларусь.**

**У сувязі з вышэйсказаным, просім паведаміць, на якой падставе імя Зянона Станіслававіча Пазьняка ўнесена ў сьпісы памежнага кантролю.**

***Выконваючы абавязкі старшыні Ю. Беленькі***

* * *

*№5/900 28.06.2001 г. Исполняющему обязанности Консервативно-Христианской Партии — БНФ Ю. Беленькому г. Минск*

**В Государственном комитете пограничных войск Республики Беларусь рассмотрены Ваши письма №34ё2001 от 30 мая 2001 года и повторное без номера и даты.**

**Сообщаем, что в соответствии с Законами „О Государственной границе Республики Беларусь”, „О пограничных войсках Республики Беларусь”, „О порядке выезда из Республики Беларусь и въезда в Республику Беларусь граждан Республики Беларусь”, пограничными войсками осуществляется пропуск граждан Республики Беларусь на основании действительных документов, дающих право на пересечение Государственной границы Республики Беларусь. При наличии у граждан Республики Беларусь действительных, оформленых в соответствии с Законом Республики Беларусь документов, последние беспрепятственно ее пересекают.**

**Для уточнения порядка оформления документов на право пересечения Государственной границы Республики Беларусь граждане Республики Беларусь за границей обращаются, как правило, в белорусские дипломатические или консульские учреждения, а на территории Республики Беларусь в паспортно-визовую службу МВД Республики Беларусь.**

**Остальные вопросы, поставленные в Вашем письме, в компетенцию пограничных войск не входят и являются прерогативой соответствующих компетентных органов Республики Беларусь.**

***Заместитель Председателя Государственного комитета пограничных войск Республики Беларусь генерал-майор Н. Кохан***

* * *

*№5/922 6 июля 2001 г. Исполняюшему обязанности Председателя Консервативно-Христианской Партии — БНФ Ю. Беленькому г. Минск*

**На Ваше повторное письмо сообщаем, что гражданин Позняк Зенон Станиславович в картотечном учете пограничного контроля не значится.**

**В соответствии с Законом Республики Беларусь „О порядке выезда из Республики Беларусь и въезда в Республику Беларусь граждан Республики Беларусь” гражданин Позняк З.С. при наличии действительного документа на право пересечения Государственной границы Республики Беларусь имеет право беспрепятственно пересечь границу в любом пункте пропуска через Государственную границу Республики Беларусь.**

***Заместитель Председателя Государственного комитета пограничных войск Республики Беларусь генерал-майор Н. Кохан***

* * *

*Пасьля атрыманьня гэтых лістоў, здарыўся апісаны намі ў пачатку выпадак з Сяргеем Навумчыкам. Потым зноў высьветлілася, што імёны Пазьняка і Навумчыка, аказваецца, значацца ў сьпісах памежнага кантролю і вердыкт „затрымаць” дзейнічае.*

*Ілжывасьць была праявай ня толькі камуністаў. За гэтакімі паводзінамі стаіць пэўны тып людзей і пэўны тып акупацыйных дачыненьняў.*

***(Рэд.)***

# М. ГРЫБ ПРА РЭФЭРЭНДУМ-95 І ЛУКАШЭНКАВЫ СЬЦЯГ

„Было падкрэсьлена і неяк зроблена ўсё — ва ўгоду Расеі. Кіраўніцтва тагачаснае Расеі вельмі было задаволенае, што ў Беларусі прайшоў такі рэфэрэндум і што ён „вырашыў” такія пытаньні.

Законнай падставы аб дзеяньні гэтай сымволікі (г.зн. лукашэнкаўскай) сёньня няма, таму што ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, вынікі рэфэрэндуму павінны былі зацьвярджацца на паседжаньні Вярхоўнага Савету. Паседжаньня Вярхоўнага Савету не было, пастановы па гэтым пытаньні Вярхоўны Савет не прымаў. Сымволіка гэтая ўведзена непасрэдна ўказам Лукашэнкі.

Незаконная сёньня сымволіка. Можна зь ёй не пагаджацца.”

***(З радыё „Свабода”)***

# ТЭЛЕВІЗАР

Наш сьвет кардынальна перамяніўся за апошнія 40 гадоў. Нельга сказаць, каб зьявіліся іншыя грамадзкія і духоўныя каштоўнасьці, але ўзьнікла шмат чаго новага. Зьмяніліся магчымасьці чалавека і вельмі рэзка. Кардынальныя перамены зьвязаныя, перш за ўсё, з інфармацыяй і камунікацыяй. Перамены настолькі радыкальныя, што яны паўплывалі на ўсё грамадзтва, на традыцыі дачыненьняў паміж людзьмі, паставілі пад сумненьне адстояныя паняцьці.

У 50-х гадах шырока зьявілася тэлебачаньне. Праз кароткі час яно пранікла ў кожны дом. Суседзі абмежавалі непасрэдныя кантакты, перасталі хадзіць адзін да аднаго на размовы, бо кожны меў ілюзію субяседніка (тэлевізар) у сваім памяшканьні.

Ніколі яшчэ людзі не валодалі такім масавым і эфэктыўным ***сродкам ўзьдзеяньня*** на сьвядомасьць, розум і пачуцьці чалавека. Інфармацыя ў сістэме ТБ, сьведама ці нясьведама, была падпарадкаваная якраз прынцыпу ***ўзьдзеяньня***, незалежна ад таго, у чыіх руках знаходзілася надайная функцыя.

***Уплыў на падсьведамасьць ёсьць галоўная адметнасьць тэлебачаньня***, чаго ня мае ў такой ступені ні радыё, ні друк, ні нават кіно, пра якое У.Ленін (які, па яго ўласным прызнаньні, нічога не разумеў у мастацтве) казаў, што для іх (для бальшавікоў) „з усіх мастацтваў галоўным зьяўляецца кіно”.

У Савецкім Саюзе ўзьдзеяньне тэлебачаньня абмяжоўвалася ў асноўным ідэалягічнай сфэрай і прасеянай інфармацыяй. Гэта было даволі нуднае тэлебачаньне, і савецкі чалавек глядзеў у ім у асноўным „апошнія паведамленьні”, кінафільмы, спартыўныя ды забаўляльныя перадачы. Тым часам, дзякуючы якраз пасьлядоўнаму дзяржаўна-партыйнаму кантролю, на экраны не пранікала брыдота, паказ гвалту, збачэнстваў, крывавых жорсткасьцяў, распусты і паскудства творчасьці разбэшчаных людзей. (Зрэшты, у СССР не існавала індустрыі такога „мастацтва”). Савецкае тэлебачаньне мела значна меншы разбуральны ўплыў на маральнасьць асобы, чым цяперашняе тэлебачаньне ў Расеі, і асабліва на Захадзе — у Эўропе і ЗША.

Узрастаньне разбуральнага ўзьдзеяньня тэлебачаньня ў сьвеце спалучана з агульным маральным крызісам дэмакратыі, які пачаўся, на маю думку, з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя і зьвязаны з паўсюдным прыходам да ўлады левых сілаў у заходніх краінах (дэмакратаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў, камуністаў, зялёных і т.п.). Палітычна рэглямантаваны дэмакратычны прынцып свабоды асобы быў пераведзены імі ў „правы чалавека” на ўсё, што не пярэчыць закону. А паколькі законам вельмі цяжка (і фактычна, немагчыма) рэглямантаваць мараль (бо маральныя дачыненьні вышэй за закон), то „правы на ўсё” стала правам на грэх.

Спробы амэрыканскіх дэмакратаў рэглямантаваць гэтую падмену (свабоды правам на грэх) у галіне заканадаўства прывялі да кур’ёзаў, да пачварных вынікаў, што супярэчаць лёгіцы і здароваму сэнсу, прыніжаюць годнасьць чалавека, разбураюць сям’ю, разьядноўваюць людзей.

На працягу вельмі кароткага часу на паверхню грамадзтва выплыла такая чалавечая гразь, пра існаваньне якой раней не магло нават прысьніцца ў кашмарным сьне. Распаўсюджаньне яе адбываецца агрэсіўна і хутка, запаланяецца адна грамадзкая галіна за другой. Асноўная барацьба йдзе за ўладу, заканадаўства і сродкі масавай інфармацыі. У значнай ступені ў антымаральным балоце патоплена мастацтва і найбольш — так званая „мас-культура”.

* * *

Нешта падобнае назіралася ў XV-XVI стагоддзях у Эўропе ў пару так званага „рэнесансу” (гэта значыць, адраджэньня паганскіх традыцыяў, свабоды людзей ад рэлігійных дачыненьняў — своеасаблівых „правоў чалавека” ў дахрысьціянскім разуменьні). Тады вельмі нізка апусьцілася мараль. Дзеці ня ведалі сваіх бацькоў, а манастыры ператварыліся ў прыстанішчы блуду і садомскай распусты. У гэты ж час ішла адкрытая разгерметызацыя ведзізму і таемных ведаў (Д.Бруна). Прапаведвалася шалёная нянавісьць да Бога і чалавека (Т. Кампанэла). Эўропа літаральна захліналася нашэсьцем цёмных сілаў, чараўнікоў, „калдуноў”, магаў, хірамантаў, астролягаў, прадказальнікаў, гадальнікаў, чарнакніжнікаў і т.п. „экстрасэнсаў” (у цяперашняй тэрміналёгіі). Усё гэта раптам павылазіла з усіх шчылінаў на паверхню жыцьця.

Але тады, вобразна кажучы, другога ўпадку Рыму не адбылося. Хрысьціянская грамадзтва знайшло ў сабе сілы знутры, стварыўшы і сьвятую інквізіцыю (Дамініканцы), і моцную апалягетыку, і ўзяўшы ў свае рукі выхаваньне эліты (Езуіты). Стабілізацыі дасягнулі праз сто гадоў.

За ўсю 2000-гадовую гісторыю эўрапейскай цывілізацыі гэта было самае небясьпечнае і самае крытычнае яе выпрабаваньне. Тут справа ішла не за ўладу, і нават не за рэлігійную дактрыну, як магло здавацца на першы погляд. ***Вырашаўся лёс чалавечай індывідуальнасьці.*** Як трактаваць чалавека, як да яго адносіцца, якая яго роля на Зямлі і ў Сусьвеце. Гэта была барацьба з антычным (паганскім) рэгрэсам у межах Хрысьціянства.

Новая індывідуальнасьць ***(індывідуальнасьць душы, якую заклаў Хрыстос)*** зь яе крытэрыямі ўнутранага сьвету асобы і вечнага існаваньня ўступіла ў канфлліікт з старой індывідуальнасьцю — індывідуальнасьцю цела і прыроднага права на задавальненьне яго вымог.

Менавіта тады вырашалася будучыня эўрапейскай цывілізацыі, бо *сэнс Хрысьціянства мог рэалізавацца толькі ў новым чалавеку*. Без стварэньня гэтага новага чалавека Хрысьціянства засталося б рэлігійнай дактрынай, ня больш.

* * *

Антыхрысьціянскія сілы зноў ідэалягічна і палітычна арганізаваліся ў Эўропе толькі праз 200 гадоў (масоны; пазьней — сацыялістычныя партыі). Але змаганьне за асобу было імі прайграна яшчэ ў XVI стагоддзі. Цяпер барацьба вялася ў сфэры ідэалёгіі і палітыкі за ўладу і сьвецкую дзяржаву, сацыяльную свабоду і права на бязбожжа.

Не праз асобу, а цераз новую дзяржаву і ўладу ў ёй, меркаваўся зварот да „свабоднага”, „натуральнага” чалавека, які павінен быў ськінуць з сябе рэлігійныя і духоўныя абмежаваньні ды сацыяльныя путы і будаваць свой „новы сьвет”, на асновах прадэкляраванай масонамі „свабоды, роўнасьці і братэрства”.

Барацьба, як звычайна ў такіх сітуацыях, выштурхнула на паверхню крайнія сілы, якія зыходзілі з агрэсіўнага бязбожжа і дыктавалі ўмовы паводзінаў ня толькі Эўропе, але ўсяму сьвету на працягу амаль што ўсяго XX-га стагоддзя.

Татальны ўціск і зьдзек над людзьмі вядзе да абмежаванасьці і духоўнага зьбядненьня асобы, да дэградацыі магчымасьцяў чалавека, але маральная дэградацыя і разбэшчаньне грамадзтва ў такіх выпадках, як правіла, затарможаныя самым таталітарным рэжымам (які забараняе ўсё). Асоба ў варунках несвабоды і рэпрэсіяў „сьціскаецца”, прыстасоўваецца і мізэрнее. Гэта яе сродак абароны, устаноўка на выжываньне. Такая асоба, аднак, у глыбіні душы захоўвае, як правіла, сваю маральную аснову.

*Развагі па ходу размовы*. Галеча і беднасьць ламаюць людзей. Але звычайны чалавек часта не вытрымлівае выпрабаваньня багацьцем. Яно часам робіцца горам для яго душы. Такой жа бядой можа стаць для яго і сацыяльная свабода, калі ён не гатовы да яе. ***Свабода патрабуе высокай якасьці духу.*** У хрысьціянскім разуменьні свабода — гэта ***магчымасьць тварыць дабро***. Гэта адначасна — маральная катэгорыя, якая характарызуе ўзровень асобы (свабода ад загана, ад страсьцяў, ад нізкіх і прымітыўных вымог). Ня кожны нявольнік, атрымаўшы сацыяльную свабоду, робіцца вольнай асобай. Але карыстацца сацыяльнай свабодай можа кожны. У гэтай супярэчнасьці закладзены вірус маральнага крызісу дэмакратыі.

* * *

Ліквідацыя камуністычнага таталітарызму ў Эўропе паспрыяла рэальнаму яе паляваньню. (Бо зьнікла таталітарная пагроза ад СССР.) Левыя з энтузіязмам узяліся за ажыцьцяўленьне ідэі аб’яднанай Эўропы. У канцы гэтай ідэі ўжо праглядваецца новая карпаратыўная імпэрыя „таталітарнай дэмакратыі”, дзе „правы чалавека” (і мы ўжо бачым гэтага „чалавека”) будуць першасныя, па параўнаньні з суверэнітэтам краіны.

Аднак не палітычныя дактрыны, і нават не эканамічныя праблемы, вызначаюць цяпер сутнасьць напружаньня ў дэмакратычным сьвеце. На паверхню выходзіць той самы суб’ект, што і ў XVI стагоддзі — чалавек разбэшчаны. Гэтак жа, як і 500 гадоў таму, ён усьведамляе сваю разбэшчанасьць як свабоду. Свабоду ўсяго: ад Бога, ад рэлігіі, ад маралі, ад сям’і, ад абавязкаў, ад грамадзтва, і нават ад сваіх справаў (за якія ня хоча адказваць). Ён лічыць, што безадказнасьць — гэта яго „правa чалавека”, і змагаецца за гэтае права ў плыні ўсіх левых сілаў.

Разбэшчаны чалавек у XXI стагоддзі, гэтак жа, як і ў XVI стагоддзі, змагаецца не за сваю нішу, а за сваё разуменьне сьвету. Канфлікт, які нарастае (ад якога, аднак, некаторыя людзі адмахваюцца і робяць

выгляд, быццам яго няма), мае якраз ***цывілізацыйны характар*** і ў пэрспэктыве (у выпадку, калі б перамог разбэшчаны чалавек), азначае крах, канец эўрапейскай цывілізацыі. (Хаця першай можа ўпасьці Амэрыка. І эканоміка тут не дапаможа.)

Дарэчы, менавіта такую цывілізацыйную калізію ўпадку маралі і страты ўсялякіх маральных крытэрыяў перажылі старажытныя Грэцыя і Рым, што і прывяло да ўсеагульнага крызісу і зьнікненьня антычнага сьвету.

Альтэрнатыва Хрысьціянству як ***свабода ўсяго*** — ужо перажытая далёка ў мінулым. Зварот да яе — гэта рэгрэс, шлях уніз, да таго, над чым некалі ўзвысіўся чалавек.

* * *

Цяпер вернемся ў пачатак, адкуль пачаліся нашыя развагі. Хтосьці зь цяперашніх дасьледчыкаў сказаў, што калі б у Гітлера было сучаснае тэлебачаньне, то невядома, як бы ўсё сталася. Тут ёсьць разуменьне асаблівага ўзьдзеяньня тэлебачаньня на чалавека.

Фактам зьяўляецца тое, што да пачатку XXI стагоддзя чалавек разбэшчаны ўжо грунтоўна ўсталяваўся і часткова загаспадарыў тэлебачаньне ў Эўропе і Амэрыцы. Пад выглядам свабоды і розных існуючых і неіснуючых правоў адбываецца агрэсіўны наступ нізасьці і бессаромнасьці, і адначасна здача пазыцыяў прыстойнасьці асобай маральнай і чалавекам разумным. Калі працэсы стануць разьвівацца гэтак і далей, то ў бліжэйшыя 10-15 гадоў хрысьціянскі сьвет будзе мець тэлебачаньне-клааку чалавечай мярзоты, збочанасьці і нізкіх паняцьцяў.

***Дрэнь выстаўляецца напаказ.*** Дрэнь і загана, гвалт і блуд сталі цяпер бізнэсам. Дрэнь прадаецца і купляецца, прыносіць прыбыткі і грошы. Таму змагацца з маральнай дэградацыяй няпроста і малавынікова толькі ў адной краіне. Праблема даўно перакрочыла нацыянальныя межы і патрабуе міжнародных захадаў. Для гэтага ў грамадзтве павінны быць іншыя каштоўнасьці, акрамя грошай.

Што сталася і што можа стацца з тэлебачаньнем у бліжэйшы час, добра ілюструе прыклад Галівуда. Сорак гадоў таму Галівуд быў зусім іншым. Хто памятае старыя галівудзкія фільмы, можа ў гэтым пераканацца. На экране тады існаваў чалавек прыстойны. У 80-х, і асабліва ў 90-х гадах, „фабрыка сноў" ператварылася ў канвэер зла. На экране фактычна няма болей вобразаў жыцьця (ня кажучы ўжо пра адлюстраваньне жыцьця нармальнага). Тут цяпер зусім іншыя людзі. Гэта штучныя вобразы, што прыйшлі з кіна-коміксаў і з рэклямных кліпаў. Забойствы, кроў, блуд, бойкі, пошласьць і распуста — усё гэта запоўніла экран Галівуда, пранікла на тэлебачаньне, ва ўсе куткі сьвету.

Экспансія паказу распусты, забойстваў і брыдоты зьяўляецца складовай часткай працэсу глябалізацыі, якая йдзе па двух накірунках: фінансава-эканамічным і культурным. Цэнтрам фінансава-эканамічнага інтарэсу зьяўляецца „Ўол-Стрыт" (Фінансавы Цэнтар амэрыканскага бізнэсу). Цэнтрам культурнай (ці, дакладней, антыкультурнай) агрэсіі ад нядаўняга часу стаў Галівуд.

Захад моцны сваёй фінансавай сістэмай. За Ўол-Стрытам стаіць рэальная сіла і рэальныя каштоўнасьці. Тым часам сучасная мастацкая культура Захаду мізэрная па сваім узроўні. Яна перажывае працэс упадку і дэградацыі. Тут даўно ўжо няма ні вялікіх духоўных ідэяў, ні станоўчых эстэтычных ідэалаў. Яе месца заступіла мас-культура, ці дакладней, — бізнэс-культура.

Фінансы і высокі тэхнічны ўзровень, дамінуючае валоданьне глябальнымі сродкамі перадачы інфармацыі (тэлебачаньне, інтэрнэт, касьмічныя спадарожнікі) забясьпечвае экспансію бізнэс-культуры і адпаведна — разбурэньне духоўнай мастацкай культуры чалавецтва.

Існуе сусьветная праблема і пагроза зьнішчэньня духоўных традыцыяў нацыянальнай гісторыі. Ісламскі сьвет рэагуе на гэты мас-культурны імпэрыялізм дзікімі, варварскімі мэтадамі барацьбы. Заходні сьвет трымаецца за свабоду слова і робіць выгляд, што праблемы няма.

Але яна ёсьць і перакрочыла ўжо межы магчымага. Лічбавае тэлебачаньне, якое разьвіваецца ў накірунку злучэньня з інтэрнэтам, адкрые яшчэ большыя магчымасьці для індустрыі брыдоты, запабягаць якой будзе надзвычай цяжка, ды й па ўсім відаць, ніхто не гатовы гэта рабіць.

* * *

Станоўчы ўплыў цяперашняга тэлебачаньня на разьвіцьцё асобы (прынамсі на Захадзе, і асабліва ў ЗША) здаецца мне надзвычай малым. Тым часам разбуральныя вынікі яго ўзьдзеяньня — навідавоку.

Асабліва відаць гэта на дзецях і моладзі. Тое, што адбываецца ў апошнія 3-4 гады ў школах Амэрыкі, — гэта поўны абсурд, які нагадвае пра пэрспэктыву канчатковага краху сацыяльнага грамадзтва ў гэтай краіне.

У кожнай амэрыканскай школе пастаянна знаходзіцца паліцыя. У клясы на лекцыі і зь лекцыяў усіх дзяцей прапускаюць праз кантрольныя дэтэктары (як у аэрапорце), выварочваюць кішэні і ранцы, адбіраюць нажы, пісталеты, балёнчыкі з газам, і нават гранаты. І тым ня менш, у школах Амэрыкі амаль кожны дзень грымяць стрэлы. Шасьцігадовыя дзеці і 16-гадовыя падлеткі страляюць па вучнях і па настаўніках за дрэнныя адзнакі, ці за заўвагі аб непаслушэнстве, ці проста так, з цікавасьці, наглядзейшыся галівудзкай эрзац-прадукцыі ў тэлевізары.

Ужо дзясяткі забітых дзяцей (не кажам пра раненых). Дзіця не адрозьнівае таго, што бачыць па тэлебачаньні, ад рэальнага жыцьця. Яно яшчэ ня здольнае ацаніць і прадбачыць вынікі сваіх дзеяньняў, а ў рукі яму ўжо ўклалі пісталет. Гэта зрабіў тэлевізар. Дзецям усё гэта здаецца забаўкай, як на экране.

Цяпер амэрыканскія школьнікі страляюць у школах, але праз нейкі час выстралы загучаць у сям'і. І, дарэчы, ужо гучаць.

Прычыны розныя. І тое, што ў Амэрыцы манія асабістай зброі, і што яна ўсім даступная. І тое, што ў ЗША цяпер інтэнсіўна разбураецца сям'я, і тое, што многія амэрыканцы ўжо перасталі разумець дзіцячую псіхалёгію, бо большасьць жыве для сябе, для свайго задавальненьня і сваіх інтарэсаў, а не для сваіх дзяцей (як прынята ў нас). Прычынаў шмат. Але галоўная і агульная прычына — тэлевізар, тое, што дзеці ў ім бачаць. Дзіцячая псіхіка ўжо ня вытрымала.

Калі ж зьяўляюцца энтузіясты, каб абмежаваць паказ забойстваў і паскудства, то ў іх нічога не атрымліваецца. Галоўны аргумант супраць іх — свабода слова. Маўляў, чалавек свабодны і павінен мець права і магчымасьць выбару.

Але дзеці і падлеткі ня ўмеюць рабіць асэнсаваны выбар. Больш таго, клясычная норма права гаворыць аб тым, што ***ніхто не павінен нікога змушаць рабіць выбар***. Бандыт, які кажа чалавеку рабіць выбар кшталту „кашалёк або жыцьцё" ёсьць проста бандыт, а не прыхільнік свабоды выбару.

Для шмат якіх людзей цяжка выбраць цяпер нават паміж тэлепраграмамі (асабліва ў вечаровы час). Тэндэнцыя так званай „свабоды выбару" рухаецца да таго, што нармальнаму чалавеку застанецца толькі адзін „выбар": альбо ўключаць, альбо не ўключаць. Так рэалізуецца права на свабоду выбару інфармацыі па прынцыпу: „альбо кашалёк, альбо жыцьцё".

* * *

У пазнаваўчым сэнсе сітуацыя са свабодай слова ня ёсьць тупіковая. Яна патрабуе пэўнага аналізу і прыняцьця пэўных рашэньняў, зыходзячы з той нормы (амаль аксіёмы), што ***свабода без берагоў ёсьць несвабода***. Бо ня могуць асобныя людзі быць свабоднымі ад грамадзтва і адзін ад аднаго. Крыміналітэт як паразітычная агрэсіўная форма свабоды ад грамадзтва прыводзіць да яшчэ большай несвободы чалавека ў крымінальнай супольнасьці.

Імкненьне да неабмежаванай свабоды ёсьць у аснове сваёй крымінальнае, эгаістычнае і прымітыўнае жаданьне несвабоднага чалавека, які хацеў бы збавіцца ад абавязкаў перад людзьмі, культурай і прыродай.

Грамадзтва валодае сістэмай абмежавальных мэханізмаў, каб свабода

не ператварылася ў несвабоду, але яно не заўсёды здольнае іх ужываць, бо стрымліваньне зла залежыць ад шматлікіх фактараў, дзе найбольшай супрацьдзеючай сілай зьяўляецца інтэрас бізнэсу і прага нажывы.

Практыка паказвае, што права грошай тут нават ня ставіцца пад сумніў. Ніякая страляніна ў школах, ніякія забойствы і ніякая маральная шкода людзям ня спыняць нажыву, нават калі кананада загучыць па ўсім сьвеце, бо сам ***бізнэс на чалавечых заганах, нізкіх інстынктах і комплексах ёсьць узаконеным дзеяньнем зла***.

Можна ўявіць, як далей будзе разьвівацца легалізацыя разбэшчанага чалавека і якую ролю адыграе ў гэтым тэлебачаньне. Верагодны варыянт: усё будзе ісьці, як і цяпер, — зьязджаць па нахіленай плоскасьці да цывілізацыйнага распаду эўрапэйскай культуры.

Магчыма, аднак, што ў грамадзтве адбудуцца перамены, да ўлады прыйдуць адказныя людзі ды разумныя сілы, і праблема пачне вырашацца на міжнародным узроўні. Будуць уведзеныя пасьлядоўныя заканадаўчыя абмежаваньні на зло, наладжаны кантроль грамадзтва і *перагледжана лібэральная формула свабоды* (у тым ліку і свабоды слова), якая ня можа быць абсалютнай, ня можа быць адасобленай ад маралі, ад павагі да чалавечай асобы, ад шанаваньня сьвятога і чалавечага. Свабода ня можа быць зброяй рэгрэсу і разбурэньня, хто б ёй ні карыстаўся.

Свабода — гэта вялікая Боская каштоўнасьць. Але ёсьць бязбожнае разуменьне свабоды (якім пераважна імкнецца жыць цяперашні сьвет), калі чалавек хоча быць свабодным ад Бога і ад усяго. Бальшавікі таксама змагаліся за свабоду. У іх было сваё разуменьне свабоды. Што атрымалася з бальшавіцкай „свабоды", мы ведаем.

Мяркую, што ў вольнай справядлівай Беларусі будзе нацыянальнае тэлебачаньне высокага ўзроўню. Яно, напэўна, таксама сутыкнецца з агрэсіяй распусты і з тэлевізійнай бізнэс-культурай. Але мы, беларусы, мусім быць падрыхтаванымі да гэтага, каб не дапусьціць ўкараненьня чужароднага.

Беларуская ўлада, якая будзе гэта разумець, павінна памятаць адно: заканадаўчыя і арганізацыйныя захады супраць распаўсюджаньня тэлебізнэсу на разбэшчанасьці ***мусяць прымацца адразу***, без прамаруджаньня, цьвёрда і пасьлядоўна.

Калі ў гэтай справе час будзе страчаны і на Беларусі ўмацуецца індустрыя дрэні, тады гэта станецца, як з мафіяй — вечная барацьба, якая змарнуе грамадзкія сілы.

Аднак веданьне праблемы — гэта ўжо палова справы. Ёсьць надзея, што беларусы ня стопчуць свой гонар і захаваюць высокі ўзровень людзей.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***кандыдат мастацтвазнаўства***

*14 красавіка 2001 г.*
*Нью-Ёрк*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(па матэрыялах „Народнай Волі", „Пагоні", „Нашай Свабоды", SANA; травень-чэрвень 2001 г.)*

■ З пачатку гэтага году ў Беларусі зафіксаваныя самыя высокія тэмпы інфляцыі сярод краінаў СНД. Паводле зьвестак Міжнароднага статыстычнага камітэту СНД, у студзені-траўні інфляцыя ў Беларусі склала 19,9%. На наступным месцы Расея — 10,9%, потым ідзе Таджыкістан — 9,3%.

■ Масавы характар набываюць звальненьні на Гомельскім радыёзаводзе. На працягу першага паўгоддзя тут былі звольненыя 235 чалавек, 93-м працаўнікам паведамілі аб маючым адбыцца звальненьні. Рыхтуецца скарачэньне яшчэ 300 чалавек. Завод у глыбокім катастрафічным крызісе. Яму нават адключылі газ. Грошай на выплату чэрвеньскага заробку няма.

■ 37% прадпрыемстваў Горадзеншчыны стратныя, на 131 прадпрыемстве зафіксавана зьніжэньне вытворчасьці, а рэнтабельнасьць мясцовых прадпрыемстваў складае 7,3%, замест неабходных 25%.

■ Згодна зьвестак ААН, на тысячу жыхароў у Беларусі налічваецца ўсяго 0,3% кампутара з доступам у інтэрнэт. У той жа час у Польшчы гэты паказчык — 11,4; Летуве — 7,5; Расеі — 3,5; Украіне — 1,2; Грузіі — 0,4; Арменіі — 0,9%. Лёзунг беларускага інтэрнэт-клюбу — „Дагонім і перагонім Афрыку!"

■ Міністэрства статыстыкі і аналізу: запазычанасьць па заробках рабочым і служачым складае ў Беларусі 12,6 мільярдаў рублёў, — у чатыры разы боль, чым было на пачатку года.

■ Урад Беларусі наважыўся на манумэнтальны гуманітарны жэст, прыняўшы рашэньне аказаць дапамогу Якуціі. Туды выдзеленыя фінансавыя сродкі на суму, роўную 20 тысячам даляраў.

■ Зь беларускага тэлебачаньня месяц таму выдалілі камуніста Чыкіна, пры якім тэлепрапаганда стала яшчэ больш нуднай і навязьлівай. Урэшце — 17 ліпеня на БТ дачакаліся новага начальніка. **Валеры Скварцоў** мае яркі паслужны сьпіс: ад пасады інструктара цк камсамолу Беларусі да намесьніка начальніка Галоўнага інфармацыйнага ўпраўленьня выканкаму „саюзу" РФ і Беларусі.

■ Беларуская зямля засьмечаная расейскімі ракетамі. У лесе пад Шчучыным на Горадзеншчыне, дзе да 1991 г. стаяла ракетная частка, знайшлі стратэгічную ракету. Яе даўжыня 8 мэтраў, вага 6 тонаў.

Беларусь наведаў галоўнакамандуючы Ўзброенымі Сіламі ЗША ў Эўропе і Вярхоўны камандуючы Аб'яднанымі сіламі НАТО ў Эўропе генэрал Джозэф Ролстан. Разам зь вялікай групай амэрыканскіх афіцэраў і беларускімі лекарамі 4-зоркавы генэрал урачыста адкрыў Цэнтар пераліваньня крыві пры Гомельскім шпіталі хуткай дапамогі. Праект фінансавала камандаваньне войскаў ЗША ў Эўропе — 420 тысячаў даляраў. З кастрычніка 1999 г. па кастрычнік 2000 г. ЗША выдзелілі Беларусі дапамогу на суму ў 24 мільёны даляраў.

■ Грамадзянская ініцыятыва „Незалежнае назіраньне" падрыхтавала маніторынг парушэньняў заканадаўства падчас кампаніі па зборы подпісаў ініцыятыўнымі групамі прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта Беларусі. Вось як зьбіраліся подпісы за Лукашэнку. ***Бялынічы***: у РАНА зьбіралі подпісы сярод супрацоўнікаў падчас выплаты заробку. ***Горкі***: кіраўнікі прадпрыемстваў накіроўвалі сваіх падначаленых у спэцыяльнае памяшканьне Горацкага РАУС, дзе пад камандай дырэктаркі школы №2 **Тамары Рабкевіч** быў арганізаваны „збор подпісаў". Прарэктар Сельгасакадэміі па выхаваўчай працы **Неўдах** хадзіў па кватэрах Акадэміі і прымушаў падпісвацца, пагражаючы нязгодным непрадоўжваньнем кантракту. ***Берасьце***: адміністрацыя дывановага камбінату раздала рабочым падпісныя лісты з заданьнем сабраць па 10 подпісаў. ***Кобрын***: на мясцовых прадпрыемствах ПТФ, „Ручаёк", „Сітма" подпісы зьбіралі або ў кабінэце дырэктара, або непасрэдна на прахадной. ***Лунінец***: на заводзе „Палесьсеэлектрасіла" адміністрацыя прымушала работнікаў прыносіць пашпарты і падпісвацца за Лукашэнку. Нязгодным пагражалі звальненьнем.

■ Лукашэнкаў „славянскі базар" даўся ў знакі ўсім віцеблянам. Штовечар у навакольлі летняга амфітэатру зьбіраліся тысячы гулякаў. Сотні гандлёвых кропак прадавалі кругласутачна піва і гарэлку. Віцебская міліцыя, дарэчы, зьвярталася да ўладаў напярэдадні „базару" з просьбай абмежаваць продаж сьпіртных напояў. Заўпарцілася гандлёвая сістэма, якую падтрымаў рэжым. Начальнік Кастрычніцкага РАУС **Уладзімер Куновіч**, на падначаленых якога лёг асноўны цяжар аховы парадку, заявіў журналістам, што „фэстываль ператварыўся ў сутачную папойку дзеля папаўненьня бюджэту". Уначы з 21 на 22 ліпеня ў адной са шматлікіх боек навакол „базару" загінула 21-гадовая дзяўчына.

■ Страшная статыстыка так і не навучыла беларусаў трымацца падалей ад Расеі. Ужо сёлета на тэрыторыі Расеі зьніклі бяз вестак **96** грамадзянаў Беларусі. Зь іх **65** чалавек зьніклі ў Маскве і Маскоўскай вобласьці. **57** зьніклых выехалі туды на заробкі. Больш „пашэнціла"

групе гастарбайтэраў са Слуцка, якія завіталі ўвесну ў расейскую сталіцу па запрашэньні нейкай фірмы ў пошуках працы. „Русские товарищи” сустрэлі іх на вакзале, сабралі пашпарты і пасадзілі ў аўтобус. У аўтобус увайшоў аўтамаччык, і ўсіх павезьлі кудысьці за Маскву. Выгрузілі, пасялілі ў бараکі, у дзень давалі па 10 рублёў (менш за паўдаляра) на пракормку. Забясьпечылі працай на будоўлі, дзе камандавалі таксама аўтаматчыкі. Праз два месяцы згаладнелых, брудных і зьнясіленых беларусаў завезьлі назад на вакзал і пасадзілі на цягнік. Усе былі радыя, што іх не расстралялі.

■ З пачатку гэтага году кошты на спажывецкія тавары ў нашай краіне падвысіліся на 24%.

■ Зь беларускімі пасламі рэгулярна адбываецца нешта дзіўнае. Памятаем, як „японскі пасол” **Краўчанка**, гэты „мацёры чалавечышча”, адзін з самураяў так званай „намэнклятурнай апазыцыі”, у адну ноч трансфармаваўся ў паўнамоцнага пасланца рэжыму на Далёкім Усходзе. Цяпер чарга за далёкай Поўначчу. **Міхаіл Марыніч**, верны сатрап Лукашэнкі і пасол Беларусі ў Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі, раптам падаўся ў канкурэнты свайму гаспадару на прэзыдэнцкія выбары ды прайграў. У выніку паўночны пасол напісаў гераічную, з элемэнтамі патэтыкі (ну, проста кантата!) заяву аб адстаўцы: „Не лічу магчымым апраўдваць сістэму дыктату, дэградацыю эканомікі, якая вядзе да галечы людзей, сталае парушэньне правоў і свабодаў грамадзянаў, міжнародную ізаляцыю Беларусі...” Хаця калі ўжо **Ваня Ціцянкоў** узьняў сьцяг барацьбы з дыктатурай, то мэтамарфозам з пасламі зьдзіўляцца не даводзіцца.

■ *27 ліпеня* сябры *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* правялі пікет у цэнтры Воршы. Удзельнікі пікету трымалі плякаты, прысьвечаныя ўгодкам Дэкларацыі пра суверэнітэт Беларусі *(„Беларусь была, ёсьць і будзе эўрапейскай незалежнай дзяржавай!”* і інш.) Да пікету далучылася больш за 150 чалавек.

■ У Нямеччыне затрыманыя грамадзяне Беларусі, якія рабавалі банкі. Паліцыя перасьледвала рабаўнікоў з дапамогай верталётаў і аўтамабіляў. Удалося затрымаць двух з траіх. Гангстэры адстрэльваліся, паліцыя страляла ў адказ, параніўшы іх. Праз дзень затрымалі і трэцяга злачынцу. Ім па 22-25 гадоў.

■ *30 ліпеня* беларускія ўлады адмовіліся прадаставіць уязныя візы міжнародным назіральнікам зь Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЭ. Афіцыйная прычына адмовы — надта раньні прыезд.

З пачатку году ўзрасьлі тарыфы на жыльлёва-камунальныя паслугі. Так за карыстаньне ліфтам плата ўзрасла на 25,6%, а кватэрплата — на 25,7%, плата за радыёкропку — на 32,4%, халодная вада і каналізацыя — на 58,5%, газ — на 64%, вываз адходаў — на 76%, гарачая вада — у 2,2 разы.

■ Нядаўна міжнароднай супольнасьці быў прадстаўлены чарговы даклад Сусьветнай кампаніі за свабоду слова „Артыкль 19” пад назвай „Беларусь — мэханізм рэпрэсіяў. Перашкоды на шляху да свабодных і адкрытых выбараў у Беларусі”. Спроба прадстаўнікоў гэтай міжнароднай арганізацыі прэзэнтаваць даклад ў Беларусі не ўдалася. Беларускія ўлады адмовілі выдаць ім уязныя візы. Міжнародныя экспэрты крытыкуюць палажэньні лукашэнкаўскага заканадаўства, якія ўстанаўліваюць адказнасьць „за паклёп або абразу гонару” прэзыдэнта ды іншых афіцыйных асобаў. Гэта ёсьць грубае парушэньне свабоды выказваньня думкі. Лукашэнкаўскі праект закону аб інфармацыйнай бясьпецы яўна супярэчыць Канстытуцыі і міжнародным абавязацельствам Беларусі, таму што ўстанаўлівае, практычна, поўны кантроль дзяржавы за інфармацыяй ва ўсіх сфэрах жыцьця. У дакладзе гаворыцца таксама пра экспрапрыяцыю абсталяваньня незалежных выданьняў, фактычную забарону на рэкляму ў недзяржаўных выданьнях, перашкоды ў арэндзе памяшканьняў, неабгрунтаваную законам перарэгістрацыю недзяржаўных газэтаў, напады на рэдакцыі і офісы.

■ Забясьпечанасьць сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Беларусі палівам значна горшая, чым летась. Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, у першым паўгоддзі ў гаспадаркі паступіла на 13% меней дызельнага паліва і на 26% меней бэнзіну, чым летась. Найменшы ўзровень паставак дызпаліва ў Берасьцейскай і Магілёўскай вобласьцях (82 і 84% ад леташняга ўзроўню), бэнзіну — у Магілёўскай і Гомельскай вобласьцях (69 і 71%).

■ Журналісты запыталі амбасадара ЗША ў Беларусі Майкла Козака, як ён ставіцца да прысуду былому супрацоўніку амэрыканска-нямецкага цэнтру дасьледваньняў бясьпекі імя Дж. Маршала сп. Крыстафэру Ленцу (нядаўна яго асудзілі ў Беларусі „за шпіянаж” на 7 гадоў у калёніі строгага рэжыму). Амбасадар сказаў: „Мы ня маем ніякай інфармацыі пра тое, што рабілі ягоныя абвінаваўцы ў ізалятары і на судзе, каторы ніхто ня змог убачыць. Мне гэта гаворыць пра сістэму правасуддзя больш, чым што-небудзь іншае”.

■ Дзесяць тысячаў вольнанаёмных работнікаў Міністэрства абароны Беларусі атрымліваюць заробак на ўзроўні „пражытачнага мінімуму” (да 51,9 тыс. рублёў) і, фактычна, зьяўляюцца жабракамі. Многія высокакапастаўленыя спэцыялісты вымушаны былі звольніцца, што адмоўна сказалася на ўзроўні падтрыманьня ваенных частак у баявой гатоўнасьці.

■ „Адзіны кандыдат” Ул. Ганчарык заявіў: „У Беларусі ня будзе Каштуніцы — будзе Ганчарык”. Як арыгінальна!.. Потым ён расказаў журналістам пра апошнюю са сваіх паездак у Маскву: „У адміністрацыі Пуціна я ня меў ніякіх сустрэчаў, але перамаўляў з вельмі сур’ёзнымі людзьмі... былі вельмі станоўчыя зрухі па сітуацыі ў Беларусі з боку Крамля”.

■ На Гомельшчыне — падрыхтоўка да маштабнай паказухі. У верасьні ў Мазыры пройдуць сёлетнія „Дажынкі-01”, а Сьветлагорск зьбіраецца сьвяткаваць сваё 40-годдзе. У Мазыры ламаюць асфальт, мяняюць яго на плітку (на ўсіх прадпрыемствах гораду месяцамі не выплочваюць заробкі — грошы пайшлі на падрыхтоўку дажынкавых відовішчаў). У Сьветлагорску, сусьветна вядомым некантралюемай наркаманіяй і хваляй СНІДу, актыўна рэстаўруюць забудову. Грошы бяруць, зразумела, з прадпрыемстваў і прыватнікаў. Навешаюць нават новыя шыльды з назвамі вуліцаў. Але прачытаць іх можна будзе толькі ўдзень, бо ўначы горад амаль не асьвятляецца (такі вось **Сьветла**горск).

■ Ня раз Лукашэнка пышна выказваўся пра сваю гарачую любоў да абаронцаў Айчыны і пра клопат дзяржавы аб іхным здароўі. Каб убачыць гэта, трэба наведаць 432-гі Галоўны ваенны клінічны шпіталь у Менску. Шпіталь перапоўнены хворымі афіцэрамі і жаўнерамі. Але ўстанова знаходзіцца ў становішчы жабрака. Летась шпіталь па матэрыяльна-тэхнічным забесьпячэньні прафінансаваны толькі на 12%, а за травень сёлета на 8,8%. Кіраўніцтва радае гэтаму, бо ў студзені сёлета было атрымана ўсяго 0,9% неабходных сродкаў. Медыкі вымушаныя закупляць найтаньнейшыя лекі, якія, зразумела, малаэфэктыўныя. Будынак знаходзіцца ў аварыйным стане, могуць абрынуцца перакрыцьці. Нядаўна абрынулася столь у мясцовым клюбным памяшканьні, разьлічаным на 350 месцаў.

***Валеры БУЙВАЛ***

# APPEAL ON THE NON-RECOGNITION OF RESULTS OF THE ELECTORAL FARCE AND OF LUKASHENKA REGIME

The large majority of the Belarusan society and the whole civilized world hoped that presidential elections 2001 in Belarus would became a democratic form of the free political choice of Belarusan electors and would cause the cardinal positive changes of the political situation in our country. It is

necessary to admit that this was an illusion. Democratic elections are impossible in conditions of the dictatorial regime based on the Russian imperialist circles and on the Russian FSB-KGB structures. Practice has demonstrated that appeals to Lukashenka made by the international society in order to „mitigate" its policy and to democratize the system were not accepted. Regime acted impudently and aggressively against both Belarusan citizens and foreign observers, diplomats etc. Regime has had a strong support of its master – Russian empire. Only Russian politicians and president Putin have expressed the absolute support of Lukashenka's policy and the full recognition of results of the electoral farce (even before the official announcement of results of the poll). Russian position contrasts to the unanimous refusal to recognize Lukashenka regime by the whole democratic international society. Reason of the Russian position is clear – Lukashenka and his regime try to sale our country to Russian empire, they are traitors of the national interests of Belarus.

Everybody was shocked by the frauds made by the regime on so large scale. Lukashenka has falsified and added in behalf of himself till 40% of the poll. The final results don't correspond to a considerable extend to the level of political support of Lukashenka by the Belarusan society. Observations and interrogations made by the independent observers witness the systematic frauds prepared and executed by state structures, electoral commissions of all the levels and by mass media subordinated to the regime. A cynical criminal act on an extraordinary large scale has been committed in Belarus. In accordance with Belarusan laws (if they would be respected in our country) results of the electoral farce should not be recognized and criminals should be brought to trial.

Intimidation and repressions dominated all the stages of the electoral campaign. Regime has violated all the norms of the actual laws and international democratic norms. Representatives of the opposition political parties and NGOs were not included into the central and local electoral commissions. Police and KGB officers attacked and arrested the collectors of signatures which supported the alternative candidates. State mass media supported only one candidate – Lukashenka. Editorial offices and publishing houses of the independent mass media have been exposed to police repressions. Regime blackmailed and provoked the opponents. Lukashenka has mobilized the whole state structure to carry out the frauds: police and procurator's offices, special services, nomenclature of the executive power, directors of the enterprises and institutions. They used the tactic of intimidation and economic methods against their staff. On September 4 has been started the „preliminary voting". Electoral frauds became extraordinarily systematic. This was a forced voting. During the work-time the people was transported in special busses to the polling-stations in order to secure a high percentage of the preliminary voting. Using this system the administration has secured in different regions results of the preliminary voting until 60% of the general number of voters. These fantastic numbers witness the violence against the electorate and the profanation of the idea of democratic and free elections.



*Пінск. 2001 год. Краявід зь міліцыянерам.*

Regime has directed the main blow against activists of the Conservative Christian Party – BPF. Members of our Party have been arrested, beaten, brought to trial by the police and special services. These methods have been used in the whole country.

On September 9 (the main day of voting) observers have revealed that electoral commissions of all the levels functioned under control of the representatives of executive power. Non-citizens of Belarus (mainly Russian citizens) participated in voting. They have been included illegally into the electoral lists, as well as very many teenagers and deceased persons. Regional electoral commissions were situated in the offices of the state administration and were controlled by the administration. In many polling-stations commissions have refused to accredit the observers. Many observers have been expelled by police from the polling-stations. The main frauds have been executed during the poll. Police interfered and helped to remove observers far from the places where the bulletins have been counted. Observers could see only the backs of commission's members at a distance of 6-10 meters. But in several cases observers could all the same see that the piles of counted ballot papers don't correspond to the official statistics about the „complete victory" of Lukashenka. Observers of the Conservative Christian Party – BPF have drawn hundreds of acts on the facts of frauds. These acts have been handed over to the international organizations.

A.Lukashenka is not the elected president, he is not the legal leader of the executive state power.

***Belarusan Popular Front „Adradzennie" and Conservative Christian Party – BPF don't recognize the elections on September 9, 2001 as democratic and legal. We appeal to all the state administrations and Parliaments of OSCE countries ( which have send observers and representatives in Belarus) not to recognize these elections and the legality of the acting state power in Belarus.***

***We declare that it is necessary to abrogate falsified results of the elections on September 9 and to carry on new presidential elections in Belarus under control and protection of the international organizations.***

We appeal to Belarusan people to defend our independence, language and property.

Belarus ought be a state of justice and democracy, where the Belarusan state sovereignty, laws, culture and human rights would be respected. Belarus is against the dictatorship, our people supports justice and civilized cooperation with the whole democratic world.

***Soim of the Belarusan Popular Front „Adradzennie"***
***and Conservative Christian Party—BPF***

*September 22, 2001* *(Пераклаў зь беларускай мовы В. Буйвал)*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**